## РАШЭННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# АБ СТАНЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ У 2010 ГОДЗЕ

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., намесніка Старшыні Марыскіна А.У., суддзяў Бойка Т.С., Варановіча Т.В., Данілюка С.Я., Ізоткі У.П., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Рабцава Л.М., Сяргеевай В.Г., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П., разгледзеўшы ў судовым пасяджэнні пытанне аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2010 годзе, кіруючыся артыкуламі 22 і 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў,

**ВЫРАШЫЎ:**

1. Прыняць Пасланне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2010 годзе» (дадаецца).

2. Апублікаваць Пасланне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2010 годзе» ў афіцыйным перыядычным друкаваным выданні «Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь», газетах «Звязда» і «Народная газета», а таксама ў часопісе «Веснік Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь».

**Старшынствуючы —**
**Старшыня Канстытуцыйнага Суда**
**Рэспублікі Беларусь П.П. МІКЛАШЭВІЧ**

*25 студзеня 2011 г., г. Мінск*
*№ Р-565/2011*

# ПАСЛАННЕ
## КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
# АБ СТАНЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ У 2010 ГОДЗЕ

***Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь***

***Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь***

***Савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь***

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца народ. Народ ажыццяўляе сваю ўладу непасрэдна, праз прадстаўнічыя і іншыя органы ў формах і межах, вызначаных Канстытуцыяй.

Беларускі народ выказаў сваё суверэннае волевыяўленне на прайшоўшых выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія праведзены ў адпаведнасці з нормамі і прынцыпамі Канстытуцыі і заснаваным на іх выбарчым заканадаўствам, што забяспечыла свабодны і дэмакратычны характар выбараў.

На чацвёртым Усебеларускім народным сходзе, які ўяўляе канстытуцыйную форму непасрэднага ўдзелу грамадзян у кіраванні справамі грамадства і дзяржавы, былі адобраны асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011—2015 гады.

У мінулым годзе грамадзяне Рэспублікі Беларусь рэалізавалі таксама сваё канстытуцыйнае права на ўдзел у вырашэнні дзяржаўных спраў шляхам выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Дзейнасць Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, закліканага ажыццяўляць кантроль за канстытуцыйнасцю нарматыўных прававых актаў у дзяржаве, была накіравана на забеспячэнне вяршэнства Канстытуцыі і яе непасрэднага дзеяння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, адпаведнасці нарматыўных прававых актаў Канстытуцыі, зацвярджэнне канстытуцыйнай законнасці ў нарматворчасці і правапрымяненні.

Канстытуцыйны Суд прымаў рашэнні, у якіх фармуляваў прававыя пазіцыі праз прызму такіх канстытуцыйных каштоўнасцей, як дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава, правы і свабоды чалавека, вяршэнства права, справядлівасць і роўнасць, парламентарызм, канстытуцыйная эканоміка, з улікам неабходнасці іх далейшага развіцця.

**I**

Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 чэрвеня 2008 г. № 14 «Аб некаторых мерах па ўдасканальванню дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь» Канстытуцыйнаму Суду нароўні з іншымі паўнамоцтвамі прадастаўлена права ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці ўсіх законаў, прынятых Палатай прадстаўнікоў і адобраных Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, да падпісання іх Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Прававыя пазіцыі Канстытуцыйнага Суда, сфармуляваныя ім у рашэннях, прынятых у парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў, накіраваны на папярэджанне парушэнняў канстытуцыйнай законнасці, выключэнне магчымых негатыўных вынікаў дзеяння неканстытуцыйных норм законаў, дасягненне аднастайнасці правапрымяняльнай практыкі. Гэта садзейнічае павышэнню якасці законаў, эфектыўнасці прававога рэгулявання ў цэлым. Такім чынам, у Рэспубліцы Беларусь ствараюцца ўмовы для больш поўнай рэалізацыі канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права, забеспячэння канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян, правоў і законных інтарэсаў арганізацый.

Канстытуцыйны Суд у 2010 годзе ў парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў разгледзеў 129 законаў, у тым ліку 80 законаў аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў.

Пры правядзенні абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў у рашэннях Канстытуцыйнага Суда выкладаліся прававыя пазіцыі станоўчага зместу, у якіх канстатавалася замацаванне ў законах механізмаў рэалізацыі канстытуцыйных прынцыпаў і норм дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы, у тым ліку вяршэнства права, прыярытэту агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права, гарантый дзяржавы па наданню ўсім роўных магчымасцей свабоднага выкарыстання здольнасцей і маёмасці для прадпрымальніцкай дзейнасці, роўнасці ўсіх перад законам, абмежавання правоў і свабод асобы толькі ў выпадках, прадугледжаных законам, а таксама канстытуцыйных асноў фінансавай і падатковай палітыкі.

У ходзе праверкі канстытуцыйнасці норм законаў, якія рэгулююць палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя і іншыя грамадскія адносіны, Канстытуцыйны Суд даваў ім належную прававую ацэнку, грунтуючыся на прынцыпах вяршэнства права, прававой дакладнасці, суразмернасці абмежавання правоў і свабод асобы каштоўнасцям і мэтам, якія ахоўваюцца Канстытуцыяй, а таксама на канстытуцыйных нормах, што гарантуюць абарону правоў кожнага, у прыватнасці ў сферы эканамічнай дзейнасці.

1. Канстытуцыйны прынцып вяршэнства права і заснаваны на ім прынцып законнасці прадугледжваюць строгае прытрымліванне ў нарматворчасці і правапрымяненні Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёй іншых актаў заканадаўства. У шэрагу рашэнняў, вынесеных у парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў, Канстытуцыйны Суд фармуляваў прававыя пазіцыі, накіраваныя на выяўленне канстытуцыйна-прававога сэнсу норм законаў, зыходзячы з норм і прынцыпаў Канстытуцыі, для недапушчэння неканстытуцыйнай правапрымяняльнай практыкі.

У мэтах аднастайнага прымянення на практыцы прынцыпу прамога дзеяння норм Канстытуцыі, у прыватнасці артыкула 60, які гарантуе кожнаму абарону яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом у вызначаныя законам тэрміны, і забеспячэння тым самым у поўнай меры канстытуцыйнага права грамадзян на судовую абарону Канстытуцыйным Судом у рашэнні ад 29 красавіка 2010 г. «Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь» выкладзена адпаведная прававая пазіцыя. Дадзеная пазіцыя заключаецца ў тым, што рэалізацыя крымінальна-працэсуальнай меры ў выглядзе адхілення падазронага ад пасады выклікае вынікі, якія выходзяць за рамкі крымінальна-працэсуальных адносін, што істотна абмяжоўваюць такія канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзяніна, як права на працу, гонар, годнасць і дзелавую рэпутацыю асобы. Права на судовае абскарджанне прымянення ўказанай крымінальна-працэсуальнай меры на заканадаўчым узроўні не замацавана, што абцяжарвае падазронаму доступ да правасуддзя і ўшчамляе яго права на свабодны выбар сродку прававой абароны. Канстытуцыйны Суд указаў, што пры рэалізацыі крымінальна-працэсуальнай меры ў выглядзе адхілення падазронага ад пасады яму павінна быць забяспечана гарантаваная Канстытуцыяй магчымасць звароту ў суд за абаронай сваіх правоў і свабод.

Правяраючы канстытуцыйнасць Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сакрэтах», Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 8 ліпеня 2010 г. адзначыў, што згодна з артыкулам 34 указанага Закона ўдзельнікам крымінальнага, грамадзянскага, гаспадарчага, адміністрацыйнага працэсу, якія не маюць допуску да дзяржаўных сакрэтаў, допуск да дзяржаўных сакрэтаў прадастаўляецца на падставе рашэнняў органаў, што вядуць адпаведна крымінальны, грамадзянскі, гаспадарчы або адміністрацыйны працэс. Па меркаванню Канстытуцыйнага Суда, устанаўленне такога парадку допуску ўдзельнікаў крымінальнага, грамадзянскага, гаспадарчага, адміністрацыйнага працэсу адпавядае палажэнням артыкулаў 60 і 62 Канстытуцыі, якія гарантуюць правы грамадзян на судовую абарону і на юрыдычную дапамогу, у тым ліку права карыстацца ў любы момант дапамогай адвакатаў і іншых сваіх прадстаўнікоў у судзе, іншых дзяржаўных органах, органах мясцовага кіравання, на прадпрыемствах, ва ўстановах, у арганізацыях, грамадскіх аб'яднаннях і ў адносінах са службовымі асобамі і грамадзянамі. Пры гэтым Канстытуцыйны Суд прызнаў, што адмова ўдзельнікам крымінальнага, грамадзянскага, гаспадарчага, адміністрацыйнага працэсу ў прадастаўленні допуску да дзяржаўных сакрэтаў павінна быць матываванай і абгрунтаванай і выносіцца ў строгай адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

У рашэнні Канстытуцыйнага Суда ад 22 снежня 2010 г. «Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны кодэксы Рэспублікі Беларусь» у мэтах рэалізацыі канстытуцыйных прынцыпаў законнасці і недатыкальнасці ўласнасці адзначана, што Законам уносяцца змяненні ў артыкул 132 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса («Накладанне арышту на маёмасць»), якія дазваляюць падазроным, абвінавачаным або асобам, якія нясуць па закону матэрыяльную адказнасць за іх дзеянні, пад кантролем органа, у вядзенні якога знаходзіцца крымінальная справа, рэалізоўваць арыштаваную маёмасць у мэтах пакрыцця ўрону (шкоды), прычыненага злачынствам, выплаты даходу, атрыманага злачынным шляхам, і іншых маёмасных спагнанняў. Указаныя змяненні заклікаными ўжо на дасудовай стадыі матываваць названых асоб да выканання ўказаных пазітыўных дзеянняў. Для выключэння магчымых парушэнняў канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу службовых асоб органа крымінальнага праследавання на неабходнасць няўхільнага выканання ў правапрымяняльнай практыцы прынцыпу добраахвотнасці волевыяўлення асобы на спыненне права ўласнасці, а таксама недапушчэння якога-небудзь прымушэння грамадзян, якія прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці, да ўчынення указаных здзелак па адчужэнню маёмасці ў мэтах пакрыцця ўрону (шкоды), прычыненага злачынствам, выплаты даходу, атрыманага злачынным шляхам, і іншых маёмасных спагнанняў. Па меркаванню Канстытуцыйнага Суда, прымаючы да ўвагі асобую сацыяльную значнасць прававога рэгулявання адносін уласнасці і ўстаноўленыя Канстытуцыяй гарантыі яе недатыкальнасці, пры далейшым удасканальванні заканадаўства мэтазгодна на заканадаўчым узроўні замацаваць парадак рэалізацыі маёмасці, вызваленай ад арышту, прадугледзеўшы адначасова магчымасць ажыццяўлення пракурорскага нагляду за яе рэалізацыяй.

Указаны падыход да ўсведамлення канстытуцыйна-прававога сэнсу нарматыўных палажэнняў вышэйупамянутых законаў садзейнічае адназначнаму разуменню і аднастайнаму прымяненню іх на практыцы, забеспячэнню фундаментальных канстытуцыйных прынцыпаў роўнасці і справядлівасці як неабходных умоў рэалізацыі і абароны правоў і свабод грамадзян, правоў і законных інтарэсаў арганізацый.

2. Зыходзячы з вяршэнства норм Канстытуцыі, у шэрагу рашэнняў, прынятых у парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў эканамічнага зместу, Канстытуцыйным Судом выкладзены прававыя пазіцыі, накіраваныя на выяўленне канстытуцыйна-прававога сэнсу норм разглежданых законаў з пункту гледжання рэалізацыі канстытуцыйных прынцыпаў сацыяльнай дзяржавы, гарантый роўнай абароны і роўных умоў для развіцця ўсіх форм уласнасці, свабоды прадпрымальніцкай дзейнасці, канстытуцыйных палажэнняў аб эканамічных і сацыяльных правах.

Згодна з прававой пазіцыяй, выкладзенай Канстытуцыйным Судом у рашэнні ад 6 ліпеня 2010 г. «Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб гаспадарчых таварыствах», грамадзяне, рэалізуючы канстытуцыйнае права на свабоднае выкарыстанне сваіх здольнасцей і маёмасці для прадпрымальніцкай і іншай не забароненай законам эканамічнай дзейнасці (частка чацвёртая артыкула 13 Канстытуцыі), маюць права вызначаць сферу гэтай дзейнасці і ажыццяўляць адпаведную дзейнасць у індывідуальным парадку або сумесна з іншымі асобамі шляхам удзелу ў гаспадарчым таварыстве, таварыстве або вытворчым кааператыве, гэта значыць шляхам стварэння камерцыйнай арганізацыі як формы калектыўнага прадпрымальніцтва, што вынікае з часткі другой артыкула 44 Канстытуцыі.

Разам з тым, як адзначыў Канстытуцыйны Суд, прадпрымальніцкая дзейнасць у арганізацыйна-прававой форме акцыянернага таварыства закранае інтарэсы вялікай колькасці асоб — акцыянераў, інвестараў, крэдытораў і інш., а таксама дзяржаўныя інтарэсы. Ажыццяўляючы рэгуляванне парадку стварэння, рэарганізацыі, ліквідацыі акцыянерных таварыстваў, іх прававога становішча, правоў і абавязкаў акцыянераў, а таксама забяспечваючы абарону правоў і законных інтарэсаў акцыянераў, заканадавец зыходзіць з таго, што дзяржава не мае права пазбаўляць акцыянерныя таварыствы правамоцтваў, якія складаюць асноўны змест канстытуцыйнага права на свабоднае выкарыстанне сваіх здольнасцей і маёмасці для прадпрымальніцкай дзейнасці. Паколькі ў працэсе прадпрымальніцкай дзейнасці акцыянернага таварыства могуць сутыкацца інтарэсы розных асоб, то адной з асноўных задач заканадаўства аб гаспадарчых таварыствах з'яўляецца забеспячэнне балансу іх законных інтарэсаў з улікам таго, што ў адпаведнасці з патрабаваннямі Канстытуцыі ажыццяўленне права ўласнасці не павінна ўшчамляць абараняемыя законам правы і інтарэсы іншых асоб (частка шостая артыкула 44).

Пры разглядзе ў парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва» Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 22 чэрвеня 2010 г. адзначыў, што на развіццё канстытуцыйнага прынцыпу рэгулявання дзяржавай эканамічнай дзейнасці ў інтарэсах чалавека і грамадства накіраваны нормы главы 2 указанага Закона. У гэтых нормах вызначаюцца прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў сферы падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва; віды і ўмовы аказання дзяржаўнай падтрымкі, у тым ліку фінансавай, маёмаснай, інфармацыйнай, а таксама садзейнічання знешнегандлёвай дзейнасці суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, падтрымкі гэтых суб'ектаў у сферы падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў; кампетэнцыя рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, саветаў па развіццю прадпрымальніцтва.

Са зместу прававой пазіцыі Канстытуцыйнага Суда вынікае, што рэгуляванне эканомікі і прадпрымальніцкай дзейнасці, накіраванае на стварэнне ў Рэспубліцы Беларусь спрыяльных умоў для гаспадарчай дзейнасці прадпрымальнікаў і забеспячэнне аптымізацыі ўмяшання дзяржавы ў рэгуляванне эканамічных адносін, грунтуецца на канстытуцыйных нормах і прынцыпах, згодна з якімі дзяржава прадастаўляе ўсім роўныя правы для ажыццяўлення гаспадарчай і іншай дзейнасці, гарантуе роўныя магчымасці свабоднага выкарыстання здольнасцей і маёмасці для прадпрымальніцкай і іншай не забароненай законам эканамічнай дзейнасці; рэгуляванне эканамічнай дзейнасці ажыццяўляецца ў інтарэсах чалавека і грамадства; накіраванне і каардынацыя дзяржаўнай і прыватнай эканамічнай дзейнасці забяспечваюцца ў сацыяльных мэтах; абмежаванні правоў і свабод устанаўліваюцца толькі законам у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб.

Пры ажыццяўленні абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2011 год» Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 8 кастрычніка 2010 г., грунтуючыся на палажэннях артыкула 13 Канстытуцыі, прыйшоў да вываду аб сацыяльнай накіраванасці Закона, што адпавядае характару сацыяльнай дзяржавы, якой абвешчана Рэспубліка Беларусь. У рашэнні Канстытуцыйнага Суда канстатуецца, у прыватнасці, накіраванасць гэтага Закона на рэалізацыю артыкула 49 Канстытуцыі, які гарантуе грамадзянам Рэспублікі Беларусь права на адукацыю, даступнасць і бясплатнасць агульнай сярэдняй і прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, магчымасць на конкурснай аснове бясплатна атрымаць сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю ў дзяржаўных навучальных установах. Гарантыямі рэалізацыі дадзеных правоў выступаюць палажэнні ўказанага Закона, у якіх прадугледжваюцца расходы рэспубліканскага бюджэту на адукацыю.

У рашэнні ад 11 кастрычніка 2010 г. «Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь» Канстытуцыйны Суд выклаў прававую пазіцыю, згодна з якой канстытуцыйнае права ўласнасці і канстытуцыйны абавязак грамадзян прымаць удзел у фінансаванні дзяржаўных расходаў з'яўляюцца ўзаемазвязанымі і ўзаемаабумоўленымі. Падаткаабкладанне, якое абмяжоўвае права ўласнасці, вынікае з паўнамоцтваў дзяржавы па рэгуляванню эканамічнай дзейнасці ў інтарэсах чалавека і грамадства, у тым ліку звязаных з устанаўленнем падаткаў, і адказнасці грамадзяніна перад дзяржавай за няўхільнае выкананне абавязкаў, ускладзеных на яго Канстытуцыяй. Тым не менш, памер падатку павінен быць справядлівым і разумным, забяспечваць аптымальнае спалучэнне дзяржаўных, грамадскіх і асабістых інтарэсаў.

Такім чынам, шляхам выяўлення сваіх прававых пазіцый Канстытуцыйны Суд арыентуе заканадаўца, іншыя дзяржаўныя органы на фарміраванне канстытуцыйнай эканомікі, маючы на ўвазе такое прававое рэгуляванне адносін у эканамічнай сферы, якое здольна забяспечыць дасягненне і абарону канстытуцыйных каштоўнасцей і мэт.

3. Пры праверцы ў парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў Канстытуцыйны Суд кіраваўся ў тым ліку такім прынцыпам прававой дзяржавы, што вынікае з норм артыкула 23 Канстытуцыі, як прынцып прапарцыянальнасці абмежавання правоў і свабод асобы каштоўнасцям, што ахоўваюцца Канстытуцыяй.

У рашэнні ад 22 лістапада 2010 г. «Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях» Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу на тое, што пунктам 31 артыкула 2 Закона Працэсуальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях дапаўняецца артыкулам 8.11[1], які ўстанаўлівае права супрацоўнікаў Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь прымяняць блакіроўку колаў транспартнага сродку пры ўчыненні адміністрацыйнага правапарушэння, прадугледжанага новымі часткамі 3 і 4 артыкула 18.22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях («Парушэнне правілаў спынення і стаянкі транспартнага сродку, а таксама іншых правілаў дарожнага руху»), калі вадзіцель не знаходзіцца ў транспартным сродку або ў непасрэднай блізкасці ад яго.

Па меркаванню Канстытуцыйнага Суда, прыведзеныя меры абмежавальнага характару, якія замацоўваюцца ў Працэсуальна-выканаўчым кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, адпавядаюць частцы першай артыкула 23 Канстытуцыі, у адпаведнасці з якой абмежаванне правоў і свабод асобы допускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных законам, у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб. Указаныя абмежаванні не скажаюць сутнасці канстытуцыйных правоў і свабод, не вядуць да страты іх рэальнага зместу і прымяняюцца толькі ў адносінах да пэўных катэгорый асоб. Такія абмежаванні з'яўляюцца сродкам прававой абароны грамадскага парадку, правоў і свабод іншых асоб і суразмерныя каштоўнасцям і мэтам, якія абараняюцца Канстытуцыяй.

Пры праверцы канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь» Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 29 красавіка 2010 г. звярнуў увагу на тое, што пры паскораным вядзенні крымінальных спраў у адпаведнасці з гэтым Законам дапускаюцца выключэнні з агульных правілаў дасудовага вядзення спраў, што прадугледжвае неабходнасць адэкватных гарантый недапушчэння парушэння канстытуцыйных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Прававая пазіцыя Канстытуцыйнага Суда заключаецца ў тым, што ўнясенне ў крымінальна-працэсуальнае заканадаўства змяненняў, якія цягнуць за сабой пэўныя абмежаванні правоў і законных інтарэсаў удзельнікаў крымінальнага працэсу, з'яўляецца апраўданым, калі гэтыя змяненні накіраваны на дасягненне канстытуцыйна значных мэт. У прававой дзяржаве недапушчальна зніжэнне ўзроўню крымінальна-працэсуальных гарантый як найважнейшай умовы захавання канстытуцыйных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, у тым ліку пры паскораным вядзенні крымінальных спраў.

Правяраючы ў парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга канстытуцыйнага кантролю Закон Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях прадухілення легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, і фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці», Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 4 чэрвеня 2010 г. прызнаў дадзены Закон адпаведным Канстытуцыі. Пры гэтым быў выказаны шэраг прававых пазіцый, якія датычацца ўстанаўліваемых Законам абмежаванняў у правядзенні ідэнтыфікацыі ўдзельнікаў фінансавай аперацыі, якая заключаецца, у прыватнасці, ва ўстанаўленні і фіксаванні ў адносінах да фізічнай асобы прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку (пры наяўнасці), грамадзянства, даты і месца нараджэння, месца жыхарства (знаходжання), рэквізітаў дакумента, што сведчыць асобу, уліковага нумара плацельшчыка падаткаў (пры наяўнасці), у частцы замацавання за асобамі, якія ажыццяўляюць фінансавыя аперацыі, абавязкаў па прыпыненню гэтых аперацый, а таксама ў адмове ў іх ажыццяўленні ў выпадках, прадугледжаных у Законе. Суд указаў, што абмежаванні канстытуцыйных правоў павінны быць юрыдычна допушчальнымі, сацыяльна апраўданымі, адпавядаць патрабаванням справядлівасці і з'яўляцца адэкватнымі, суразмернымі і неабходнымі для абароны канстытуцыйна значных каштоўнасцей. У тых выпадках, калі канстытуцыйныя нормы дазваляюць заканадаўча ўстанавіць абмежаванні правоў і свабод, гэтыя абмежаванні не павінны скажаць рэальную сутнасць канстытуцыйных правоў і свабод. Адносна ўстаноўленага Законам абавязку па ідэнтыфікацыі ўдзельнікаў фінансавай аперацыі Канстытуцыйны Суд прыйшоў да вываду аб тым, што заканадавец пры ўстанаўленні прававога механізму па прадухіленню легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, і недапушчэнню фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці мае права прадугледжваць меры, накіраваныя на папярэджанне такіх дзеянняў, выяўленне фізічных і юрыдычных асоб, якія іх учыняюць, а таксама ўстанаўліваць абавязак асоб, якія ажыццяўляюць фінансавыя аперацыі, праводзіць ідэнтыфікацыю ўдзельнікаў фінансавай аперацыі.

Артыкул 23 Канстытуцыі допускае магчымасць абмежавання правоў і свабод асобы. Пры гэтым, як вынікае з прававых пазіцый Канстытуцыйнага Суда, абмежаванні павінны быць абумоўлены неабходнасцю забеспячэння інтарэсаў нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб. Абмежаванні правоў і свабод грамадзян павінны ўстанаўлівацца з улікам канстытуцыйных крытэрыяў суразмернасці, забяспечваючы баланс дзяржаўных, грамадскіх і асабістых інтарэсаў.

4. Пры ацэнцы канстытуцыйнасці законаў Канстытуцыйны Суд правярае выкананне прынцыпу прававой дакладнасці. Канстытуцыйны Суд лічыць, што заканатворчая дзейнасць павінна грунтавацца на гэтым прынцыпе, які прадугледжвае яснасць, дакладнасць, несупярэчлівасць, лагічную ўзгодненасць прававых норм. Прытрымліванне дадзенага прынцыпу прадухіляе неадназначнае разуменне, а значыць, і неправамернае прымяненне юрыдычных норм, якое можа выклікаць парушэнне правоў і свабод грамадзян, правоў і законных інтарэсаў арганізацый.

У рашэнні ад 7 ліпеня 2010 г. «Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аб'ектах, якія знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы, і відах дзейнасці, на ажыццяўленне якіх распаўсюджваецца выключнае права дзяржавы» Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу на нявызначанасць некаторых норм указанага Закона. У прыватнасці, рэалізацыя норм, што вызначаюць асобныя аб'екты, рашэнне аб спыненні выкарыстання якіх па прызначэнню прымаецца адпаведна Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Саветам Міністраў або ў парадку, устаноўленым мясцовымі Саветамі дэпутатаў, і не прадугледжваюць, якія органы (асобы) прымаюць такія рашэнні ў адносінах да іншых аб'ектаў, не пералічаных ва ўказаных нормах, можа прывесці да неадназначнага іх разумення і прымянення. Акрамя таго, па меркаванню Канстытуцыйнага Суда, няясна, ці неабходна пры прымяненні Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, які допускае атрыманне ў спадчыну не толькі па закону, але і па завяшчанню, улічваць палажэнні Закона, што забараняюць учыненне грамадзянінам якіх-небудзь здзелак з маёмасцю, якая адносіцца да ліку аб'ектаў, што павінны знаходзіцца ў адпаведнасці з указаным Законам толькі ва ўласнасці дзяржавы, акрамя здзелак па адчужэнню гэтых аб'ектаў ва ўласнасць дзяржавы, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі. Канстытуцыйны Суд адзначыў, што выкладзеныя пазіцыі адносна прававой недакладнасці асобных палажэнняў Закона «Аб аб'ектах, якія знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы, і відах дзейнасці, на ажыццяўленне якіх распаўсюджваецца выключнае права дзяржавы» могуць быць прыняты да ўвагі заканадаўцам у далейшым пры ўдасканальванні норм гэтага Закона, у тым ліку зыходзячы з практыкі прымянення.

У парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю Канстытуцыйным Судом была праверана канстытуцыйнасць Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь і прызнанні страціўшымі сілу некаторых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь і іх асобных палажэнняў па пытаннях прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці». У рашэнні ад 6 ліпеня 2010 г. Канстытуцыйны Суд указаў, што для артыкула 31 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь» у новай рэдакцыі характэрна нявызначанасць прававога рэгулявання. Канстытуцыйны Суд адзначыў, што паколькі новая рэдакцыя ўказанага Закона не прадугледжвае магчымасці продажу акцый на льготных умовах, але такі продаж яшчэ будзе працягвацца пэўны час і пасля ўступлення Закона ў сілу, то ў артыкуле 31 гэтага Закона неабходна было ўстанавіць, у адпаведнасці з нормамі якіх актаў заканадаўства можна ажыццяўляць дадзены продаж акцый работнікам дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў і прыраўнаваным да іх асобам па цане, ніжэйшай за намінальны кошт акцый. З выяўленага канстытуцыйна-прававога сэнсу норм Закона «Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь» у іх узаемасувязі вынікае вывад аб магчымасці продажу на льготных умовах акцый адкрытых акцыянерных таварыстваў, створаных у працэсе пераўтварэння дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў да ўступлення ў сілу дадзенага Закона.

У рашэнні ад 6 ліпеня 2010 г. «Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўнення ў некаторыя законы Рэспублікі Беларусь» Канстытуцыйны Суд адзначыў, што адсутнасць у крымінальна-працэсуальным заканадаўстве пераліку асоб, упаўнаважаных уносіць у палаты Нацыянальнага сходу прадстаўленні аб атрыманні згоды на затрыманне або пазбаўленне асабістай свабоды іншым чынам дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, можа выклікаць неадназначнае тлумачэнне і прымяненне на практыцы норм, якія рэгламентуюць парадак затрымання або іншага пазбаўлення асабістай свабоды ўказаных асоб.

Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 30 снежня 2010 г. «Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі» звярнуў увагу заканадаўца на невыкананне ім у поўнай меры пры ўнясенні дапаўненняў і змяненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі прынцыпу сістэмнасці і комплекснасці прававога рэгулявання грамадскіх адносін, патрабавання стабільнасці прававой сістэмы, замацаваных у артыкулах 7 і 38 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь». Так, у артыкулы 24 і 50 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі Законам Рэспублікі Беларусь ад 6 мая 2010 года ўжо ўносіліся змяненні. Акрамя таго, у сувязі з прыняццем Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 2 чэрвеня 2009 г. № 276 (з улікам змянення і дапаўнення, унесеных у яго Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 3 жніўня 2010 г. № 402) змяненню падлягаюць таксама асобныя нормы законаў Рэспублікі Беларусь «Аб іпатэцы» і «Аб залогу», але ўнясенне ў іх неабходных змяненняў і дапаўненняў Законам не ажыццёўлена, што можа прывесці да недакладнасці ў правапрымяненні.

Правяраючы ў парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасць Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 30 снежня 2010 г. адзначыў, што асобныя нормы гэтага Кодэкса не забяспечваюць у поўнай меры паўнату, сістэмнасць і комплекснасць прававога рэгулявання адпаведнай сферы грамадскіх адносін. Так, згодна з пунктам 5 артыкула 25 дадзенага Кодэкса кампетэнцыя, склад і арганізацыя дзейнасці савета ўстановы адукацыі вызначаюцца Палажэннем аб савеце ўстановы адукацыі, якое зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Разам з тым савет установы адукацыі ў сілу пункта 4 артыкула 25 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі з'яўляецца асноўным органам самакіравання ўстановы адукацыі, кіраванне якім у адпаведнасці з пунктам 1 гэтага ж артыкула грунтуецца на спалучэнні прынцыпаў адзінаначалля і самакіравання, што прадугледжвае больш падрабязную рэгламентацыю пытанняў дзейнасці савета ў Кодэксе.

Па меркаванню Канстытуцыйнага Суда, у Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі мэтазгодна замацаваць таксама парадак назначэння (вызвалення) на пасады педагагічных работнікаў, у той час як у пункце 2 артыкула 50 дадзенага Кодэкса прадугледжваецца адсылачная норма, згодна з якой парадак назначэння (вызвалення) на пасады педагагічных работнікаў вызначаецца гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

У пункце 1 артыкула 86 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі прадугледжваецца, што выпускнікі, накіраваныя на працу ў адпаведнасці з дагаворам аб падрыхтоўцы навукова-га работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста (рабочага, служачага) і працуючыя, на працягу тэрміну абавязковай працы могуць быць перанакіраваны на працу (далейшае накіраванне на работу), пры гэтым падставы для далейшага накіравання на працу вызначаюцца Урадам. Аднак паколькі падставы для далейшага накіравання на працу датычацца правоў і абавязкаў грамадзян, то яны павінны ўстанаўлівацца ў заканадаўчым акце, якім з'яўляецца дадзены Кодэкс.

Агульнаправавы прынцып прававой дакладнасці непасрэдна вынікае з замацаванага Канстытуцыяй прынцыпу вяршэнства права (артыкул 7). Канстытуцыйны Суд неаднаразова звяртаў увагу на тое, што няяснасць і нявызначанасць палажэнняў нарматыўных прававых актаў, іх супярэчлівасць і двухсэнсавасць могуць прывесці не толькі да парушэнняў правоў і законных інтарэсаў грамадзян, але і да злоўжывання з іх боку сваімі правамі. Прававыя пазіцыі Канстытуцыйнага Суда адносна такіх норм заканадаўства, накіраваныя на пераадоленне недахопаў нарматыўнага рэгулявання, звернуты да суб'ектаў заканатворчай і правапрымяняльнай дзейнасці ў мэтах забеспячэння аднакачнага разумення і тлумачэння прававых норм, а таксама іх аднастайнага прымянення.

5. Папярэдні канстытуцыйны кантроль законаў аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь з'яўляецца важным напрамкам дзейнасці Канстытуцыйнага Суда. Такія законы разглядаюцца Канстытуцыйным Судом з пазіцый іх канстытуцыйнасці па зместу норм, форме акта, парадку прыняцця, а таксама з пункту гледжання размежавання кампетэнцыі дзяржаўных органаў пры іх прыняцці.

Практыка ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў паказвае, што паўнацэнная абарона правоў і свабод чалавека і грамадзяніна забяспечваецца пры ўмове належнай імплементацыі норм міжнароднага права ў заканадаўства краіны. У сувязі з гэтым уяўляецца неабходным стварэнне ўмоў для эфектыўнага прымянення норм міжнароднага права ў нарматворчай і правапрымяняльнай дзейнасці.

У рашэнні ад 10 лістапада 2010 г. «Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Закона Рэспублікі Беларусь «Аб далучэнні Рэспублікі Беларусь да Міжнароднай канвенцыі аб спрашчэнні і гарманізацыі мытных працэдур» Канстытуцыйны Суд адзначыў, што далучэнне Рэспублікі Беларусь да названай Канвенцыі павінна ажыццяўляцца з улікам узятых міжнародных абавязацельстваў у рамках мытнага саюза. Пры гэтым, па меркаванню Канстытуцыйнага Суда, трэба ўлічваць, што Рэспубліка Беларусь, Рэспубліка Казахстан і Расійская Федэрацыя (далей — Бакі) 6 кастрычніка 2007 года заключылі Дагавор аб стварэнні адзінай мытнай тэрыторыі і фарміраванні мытнага саюза. У адпаведнасці з артыкулам 5 дадзенага Дагавора з моманту стварэння адзінай мытнай тэрыторыі рэжым у адносінах да мытных пошлін і збораў, якія збіраюцца ў сувязі з імпартам або экспартам тавараў, метадаў спагнання такіх пошлін і збораў, правілаў і адміністрацыйных працэдур, што прымяняюцца ў сувязі з імпартам або экспартам тавараў, які кожны з Бакоў прадастаўляе любой трэцяй краіне на аснове міжнароднага дагавора або фактычна, не можа быць больш спрыяльным, чым рэжым, які дадзены Бок прадастаўляе іншым Бакам. Вышэйуказаныя дзяржавы з'яўляюцца таксама ўдзельнікамі Дагавора аб Мытным кодэксе мытнага саюза, падпісанага ў г. Мінску 27 лістапада 2009 года. Згодна з пунктам 2 артыкула 1 Мытнага кодэкса мытнага саюза мытнае рэгуляванне ў мытным саюзе ажыццяўляецца ў адпаведнасці з мытным заканадаўствам мытнага саюза, а ў частцы, не ўрэгуляванай такім заканадаўствам, да ўстанаўлення адпаведных правааднасін на ўзроўні мытнага заканадаўства мытнага саюза — у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў — членаў мытнага саюза.

Канстытуцыйны Суд звяртае ўвагу на тое, што ўпаўнаважаныя органы, кіруючыся часткай чацвёртай артыкула 116 Канстытуцыі, маюць права ўносіць у Канстытуцыйны Суд прапановы аб праверцы міжнародных дагаворных і іншых абавязацельстваў Рэспублікі Беларусь на адпаведнасць іх Канстытуцыі і міжнародна-прававым актам. Разам з тым такіх прапаноў у 2010 годзе, як і раней, у Канстытуцыйны Суд не паступала.

Пры вынясенні рашэнняў у парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга канстытуцыйнага кантролю Канстытуцыйны Суд, грунтуючыся на палажэннях Канстытуцыі, імкнуўся забяспечыць не толькі разуменне сапраўднага зместу канстытуцыйных норм і прынцыпаў, але і іх непасрэднае дзеянне, фарміраваў канстытуцыйнае мысленне, кіруючыся прынцыпамі вяршэнства права, роўнасці, справядлівасці, прапарцыянальнасці, свабоды прадпрымальніцкай дзейнасці, адзначаючы ў рашэннях, што дзяржава, яе органы і службовыя асобы маюць абавязкі і нясуць адказнасць перад народам, таксама як і грамадзяне адказныя перад дзяржавай за выкананне сваіх абавязкаў (артыкулы 2, 59 і іншыя артыкулы Канстытуцыі).

**II**

Канстытуцыйны Суд, ажыццяўляючы ў адпаведнасці з артыкулам 116 Канстытуцыі функцыю кантролю за канстытуцыйнасцю нарматыўных прававых актаў у дзяржаве, дае заключэнні аб канстытуцыйнасці гэтых актаў у парадку наступнага канстытуцыйнага кантролю.

Прапановы аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў у парадку наступнага кантролю маюць права ўносіць у Канстытуцыйны Суд Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Вярхоўны Суд, Вышэйшы Гаспадарчы Суд, Савет Міністраў.

У 2010 годзе ўпаўнаважаныя суб'екты з прапановамі аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў у Канстытуцыйны Суд не звярталіся.

Акрамя права ўказаных суб'ектаў на зварот у Канстытуцыйны Суд у прававой сістэме Рэспублікі Беларусь прадугледжана асобая форма ўскоснага доступу грамадзян і арганізацый да канстытуцыйнага правасуддзя — праз суб'ектаў, упаўнаважаных звяртацца з прапановамі аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў у Канстытуцыйны Суд.

Ускосны доступ грамадзян і арганізацый да канстытуцыйнага правасуддзя з'яўляецца адным са спосабаў рэалізацыі артыкула 60 Канстытуцыі, які гарантуе кожнаму судовую абарону яго правоў і інтарэсаў.

Згодна з часткай трэцяй артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў грамадзяне і арганізацыі маюць права звяртацца з ініцыятывай аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта да органаў і асоб, якія валодаюць правам унясення ў Канстытуцыйны Суд прапаноў аб праверцы канстытуцыйнасці акта. Па сваёй юрыдычнай прыродзе права грамадзяніна і арганізацыі на дадзены зварот да ўпаўнаважаных суб'ектаў уяўляе права на ўскосны доступ да канстытуцыйнага правасуддзя, гэта значыць права звярнуцца ў орган канстытуцыйнага кантролю ў апасродкаванай форме.

У 2010 годзе ва ўпаўнаважаныя органы паступіла каля 60 зваротаў грамадзян і арганізацый з просьбай аб унясенні ў Канстытуцыйны Суд прапановы аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў у сувязі з наяўнасцю ў іх, па меркаванню заяўнікаў, супярэчнасцей, якія выклікаюць неабгрунтаванае абмежаванне канстытуцыйных правоў і свабод. Аднак ні адзін з такіх ініцыятыўных зваротаў не быў падтрыманы ўпаўнаважанымі органамі, у сувязі з чым у шэрагу выпадкаў грамадзяне ў зваротах у Канстытуцыйны Суд спасылаюцца на тое, што падобная пазіцыя адпаведных упаўнаважаных органаў перашкаджае рэалізацыі іх права на доступ да канстытуцыйнага правасуддзя.

Па меркаванню Канстытуцыйнага Суда, ва ўмовах адсутнасці непасрэднага права грамадзян на падачу канстытуцыйнай скаргі ў Канстытуцыйны Суд неабходна ўстанавіць дакладную прававую рэгламентацыю ўскоснага доступу праз упаўнаважаных суб'ектаў. Такая працэдура дасць магчымасць рэалізоўваць ініцыятывы грамадзян і арганізацый аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў.

**III**

На падставе часткі першай артыкула 116 Канстытуцыі і часткі восьмай артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў Канстытуцыйны Суд мае права ўносіць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, у палаты Нацыянальнага сходу, Савет Міністраў, іншыя дзяржаўныя органы ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй прапановы аб неабходнасці ўнясення ў акты заканадаўства змяненняў і (або) дапаўненняў, прыняцця новых нарматыўных прававых актаў.

У мэтах выканання задач па забеспячэнню вяршэнства Канстытуцыі і яе непасрэднага дзеяння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, адпаведнасці нарматыўных прававых актаў Канстытуцыі, зацвярджэння законнасці ў нарматворчасці і правапрымяненні, вырашэння іншых пытанняў, прадугледжаных Канстытуцыяй, Канстытуцыйны Суд у рамках паўнамоцтваў, устаноўленых у частцы восьмай артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, на аснове аналізу прававых праблем, якія маюць значнасць для рэалізацыі канстытуцыйных норм і прынцыпаў, уносіў прапановы, накіраваныя на ўстараненне прабелаў, выключэнне калізій і прававой недакладнасці ў актах заканадаўства.

Некаторыя з прынятых Канстытуцыйным Судом рашэнняў заснаваны на аналізе інфармацыі аб наяўнасці прававых прабелаў, калізій і прававой недакладнасці ў актах заканадаўства, якая змяшчаецца ў зваротах грамадзян і арганізацый.

Усяго ў Канстытуцыйны Суд у 2010 годзе паступіў 1181 зварот, у тым ліку 1138 зваротаў грамадзян (з іх 52 калектыўныя за подпісам 2243 чалавек) і 43 звароты арганізацый.

Звароты грамадзян, як правіла, адлюстроўваюць рэальныя сацыяльна-эканамічныя працэсы ў краіне. Своечасовае рэагаванне на пастаўленыя ў іх пытанні садзейнічае аднаўленню парушаных правоў і ўмацаванню законнасці, устараненню супярэчнасцей і іншых недахопаў у заканадаўстве і практыцы яго прымянення.

У сувязі са зваротамі грамадзян прынята, напрыклад, рашэнне Канстытуцыйнага Суда ад 23 сакавіка 2010 г., накіраванае на рэалізацыю канстытуцыйных прынцыпаў роўнасці ўсіх перад законам і справядлівасці. Ва ўказаным рашэнні разгледжаны пытанні, якія датычацца прававога рэгулявання адносін, звязаных з назначэннем і выплатай грамадзянам, накіраваным на прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі, стыпендый у залежнасці ад падстаў спынення працоўнага дагавора, а таксама з вызначэннем выпадкаў, пры якіх у назначэнні дапамогі па беспрацоўю можа быць адмоўлена. Канстытуцыйны Суд прыйшоў да вываду аб тым, што заканадаўчае рэгуляванне адносін па спыненню працоўнага дагавора ў частцы вызначэння падстаў, якія ўплываюць на памер стыпендый і магчымасць назначэння дапамогі па беспрацоўю, мае патрэбу ва ўдакладненні, паколькі грамадзянам, якія адносяцца да адной і той жа катэгорыі (звольненыя з працы па прычынах, не звязаных з учыненнем імі вінаватых дзеянняў, і прызнаныя беспрацоўнымі), не забяспечваецца роўная абарона ад беспрацоўя, што не адпавядае прынцыпам роўнасці і справядлівасці.

У мэтах заканадаўчага замацавання магчымасцей рэалізацыі права кожнага на абарону ад беспрацоўя Канстытуцыйны Суд прызнаў неабходным унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» змяненні і дапаўненні, што ўдакладняюць пералік падстаў спынення працоўнага дагавора, з прычыны якіх стыпендыя беспрацоўным назначаецца ў меншым памеры ў параўнанні з агульнаўстаноўленым, і пералік падстаў спынення працоўнага дагавора, з прычыны якіх беспрацоўным можа быць адмоўлена ў назначэнні дапамогі па беспрацоўю. У сувязі з гэтым Савету Міністраў прапанавана ўнесці ва ўстаноўленым парадку ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу праект адпаведнага закона.

У рашэнні Канстытуцыйнага Суда ад 27 мая 2010 г., накіраваным на рэалізацыю канстытуцыйнага права кожнага на судовую абарону, звернута ўвага на наяўнасць прабелу ў прававой рэгламентацыі парадку разгляду ў судзе скарг асуджаных да пазбаўлення волі, арышту, пажыццёвага зняволення, асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, і адміністрацыйна арыштаваных на прымяненне да іх мер спагнання, што не ў поўнай меры забяспечвае рэалізацыю канстытуцыйнага права грамадзян на доступ да правасуддзя.

Зыходзячы з нормы артыкула 60 Канстытуцыі, замацаванае ў спецыяльных законах права асоб, фактычна пазбаўленых волі, на абскарджанне прымененых да іх мер спагнання з'яўляецца важнай гарантыяй абароны парушаных правоў дадзенай катэгорыі грамадзян, забеспячэння законнасці пры выкананні крымінальнага пакарання, адміністрацыйнага арышту і ўтрымання пад вартай. Тым не менш, заканадаўцам не вызначаны парадак разгляду ў судзе такіх скарг.

Для забеспячэння рэалізацыі ўказанага канстытуцыйнага права Канстытуцыйны Суд прызнаў неабходным заканадаўча вызначыць парадак і асаблівасці разгляду ў судзе скарг асуджаных да арышту, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення, асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, і адміністрацыйна арыштаваных на прымяненне да іх мер дысцыплінарнага спагнання, у сувязі з чым прапанаваў Савету Міністраў падрыхтаваць праект закона аб унясенні адпаведных змяненняў і дапаўненняў у Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь.

У мэтах забеспячэння канстытуцыйных прынцыпаў вяршэнства права і роўнасці ўсіх перад законам прынята рашэнне Канстытуцыйнага Суда ад 17 лістапада 2010 г., у якім адзначана, што адсутнасць у Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях палажэнняў аб адказнасці за дзеянні, якія выразіліся ў нявыплаце або няпоўнай выплаце арэнднай платы за зямельныя ўчасткі, што знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, парушэнні тэрміну прадстаўлення плацельшчыкамі арэнднай платы за гэтыя ўчасткі разліку сумы дадзенай платы, сведчыць аб наяўнасці прабелу заканадаўчага рэгулявання адпаведных адносін. Гэта можа прыводзіць як да парушэння правоў плацельшчыкаў арэнднай платы, так і невыканання плацельшчыкамі абавязку па выплаце арэндных плацяжоў, а таксама з'яўлення магчымасці неадназначнага тлумачэння і, значыць, адвольнага прымянення закона, што супярэчыць канстытуцыйнаму прынцыпу роўнасці ўсіх перад законам. Канстытуцыйны Суд прызнаў неабходным устараніць прабел у заканадаўчым рэгуляванні адносін, якія датычацца адказнасці за нявыплату або няпоўную выплату арэнднай платы за зямельныя ўчасткі, што знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, парушэнне тэрміну прадстаўлення плацельшчыкамі арэнднай платы за гэтыя ўчасткі разліку сумы арэнднай платы і прапанаваў Савету Міністраў падрыхтаваць праект закона аб унясенні адпаведных змяненняў і дапаўненняў у вышэйуказаны Кодэкс.

# «БРЭНД ГОДА» — у «Савушкіна прадукта»

**На юбілейным, дзясятым па ліку, прафесійным конкурсе «Брэнд года 2010» гран-пры конкурсу, а таксама залаты медаль у намінацыі «Малочныя прадукты» атрымаў брэнд «Ласкавае лета» ААТ «Савушкін прадукт». Усяго ў прафесійнай намінацыі, як адзначылі арганізатары конкурсу, за медалі змагаліся звыш 50 беларускіх брэндаў.**


Алена Бабкіна, намеснік дырэктара ААТ «Савушкін прадукт».

— Конкурс перш за ўсё мае педагагічнае значэнне для развіцця беларускага бізнесу, — лічыць **старшыня міжнароднага журы конкурсу Маргарыта ВАСІЛЬЕВА, дырэктар кансалтынгавай кампаніі «Папрыка брэндынг», крэатыўны дырэктар часопіса «Рэкламныя ідэі» (Расія, Санкт-Пецярбург).** — Бо частка выступоўцаў, якія абаранялі свае брэнд-пакеты, не вельмі добра разумеюць, што маецца на ўвазе пад брэндзінгам, фарміраваннем маркі і гэтак далей. І тыя парады ад журы, якія яны атрымліваюць падчас абмеркавання, я спадзяюся, дапамагаюць ім станавіцца больш прафесійнымі і дасведчанымі. Наогул, конкурс «Брэнд года» — гэта не конкурс для спажыўцоў, тут не выбіраецца найбольш яскравы і смачны прадукт. Гэта конкурс для брэнд-менеджараў і маркетолагаў, якія даносяць да спажыўца інфармацыю пра сваю прадукцыю. Так што медаль «Брэнда года» — гэта медаль брэнд-менеджара. І гэта перш за ўсё гаворыць пра тое, што на гэтым камбінаце ці фабрыцы працуюць прафесійныя людзі.

Маргарыта Васільева ўваходзіць у склад журы конкурсу ўжо некалькі год запар і лічыць, што пэўныя станоўчыя тэндэнцыі ў беларускім брэндзінгу ёсць, а таксама што кожны год члены журы адзначаюць які-небудзь цікавы брэнд-пакет, пададзены на конкурс. Маргарыта Васільева пераканана, што беларускія брэнды маюць добрую перспектыву для поспеху на расійскім рынку:

— Без сумненняў, перспектывы ў Расіі ў беларускіх брэндаў ёсць. Прынамсі, я дакладна ведаю, што і ў Піцеры, і ў Наўгародскай вобласці беларускія тавары ведаюць, а магазіны, якія імі гандлююць, карыстаюцца папулярнасцю. Вядома, хацелася б яшчэ больш яркага афармлення вашых тавараў і брэндаў, але і так беларускім брэндам поспех гарантаваны. Вось, напрыклад, мне мае калегі заказалі прывезці ад вас беларускіх цукерак, знаёмыя бабулькі заказалі абутак «Марка»... У плане прасоўвання ў вас пакуль усё робіцца тугавата, але гэтым трэба займацца, трэба прасоўваць, дзейнічаць больш смела — ну а аўдыторыя гатовая купляць і любіць, — адзначыла Маргарыта Васільева.

Усяго ў прафесійнай намінацыі сёлета было ўручана 27 медалёў. «Золата», акрамя вышэйзгаданай кампаніі «Савушкін прадукт», атрымалі «Еўраопт» (гандлёвыя сеткі і цэнтры), ТАА «Мэйпл-сэрвіс» (тавары і паслугі b2b), Eurovision in Belarus (культура і мастацтва), «Exotic» (адкрыццё года), «Бабулін гладыш» (брэнд «Спадчына») і Дзяніс Кур'ян (брэнд-персона). «Срэбра» дасталася брэндам «Галерэя смаку» (мясная прадукцыя), «Непаседа» (дзіцячае харчаванне), «Твая сталіца» (нерухомасць і страхаванне), «Белаграпрамбанк» (банкі), «Lux» (тавары і паслугі для будаўніцтва і рамонту), «Unistar» (СМІ) і «Першая будаўнічая імперыя» (адкрыццё года). Бронзавымі медалямі былі адзначаныя 12 брэндаў — «Здравушка» (малочная прадукцыя), «Ingman» (малочная прадукцыя), «Беллакт» (малочная прадукцыя), «Kucharek» (прыправы), «Гаспадар» (мука), «Сваяк» (алкагольныя напоі), «Пакадан» (нерухомасць і страхаванне), «Белавежская пушча» (спорт, адпачынак, турызм), «Купалінка» (адзенне, абутак, аксесуары), «Бархім» (бытавая хімія), «Неман» (прамысловыя спажывецкія тавары) і «Мая Славіта» (адкрыццё года).

Акрамя асноўнай часткі конкурсу, 24 суб'екты гаспадарання (банкі, фірмы, заводы, грамадскія аб'яднанні) былі адзначаны ў намінацыі «Сацыяльна адказны брэнд» у катэгорыях «Актыўная сацыяльная пазіцыя», «Лепшы працадаўца», «Ахова навакольнага асяроддзя», «Этычныя рыначныя паводзіны», «Прыватна-дзяржаўнае партнёрства». Таксама былі выбраныя 62 лідары ў спажывецкай намінацыі.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## ГАДУЮЦЬ АЛЕНЯЎ, МАРАЦЬ ПРА ТУРЫСТАЎ

**У Горацкім раёне каля аленегадоўчай фермы пабудуюць дамкі для адпачынку.**

Аленегадоўчая ферма ў СВК «Аўсянка» існуе больш за два дзясяткі гадоў. Калісьці аленяў сталі гадаваць на Гораччыне з медыцынскімі мэтамі — дзеля рагоў, з якіх выраблялiся каштоўныя лекі. За тым часам на ферме было больш за тысячу прыгожых жывёлін.

Цяпер жа тут жывуць толькі паўтары сотні аленяў. «Самыя стойкія», — жартуюць у «Аўсянцы». Сама ферма — закрыты аб'ект, плошчай у 200 гектараў. Даглядае і корміць аленяў егер.

Аднак сама сельская гаспадарка не мае даходаў ад аленегадоўчай фермы, таму тут вырашылі пабудаваць дамкі для турыстаў, якія могуць жыць паблізу і назіраць за прыгожымі жывёламі. Цікаўныя людзі тады змогуць даведацца ад егера, напрыклад, пра тое, што ў аленяў пануе матрыярхат: у статку самцамі і моладдзю кіруюць буйныя самкі.

**Ілона ІВАНОВА.**

# ДА МОВЫ — НАВУКОВА

**Ці не галоўны для ўсёй краіны прынцып на блізкую будучыню — навуковы падыход. Да вытворчасці, эканомікі, да жыцця ў цэлым. І справа не толькі ў высокіх тэхналогіях і суперпрыладах. Не менш, а можа нават і больш, важнае агульнае стаўленне: перш падумай — потым зрабі. Глядзіш, і вынік перасягне ўсе спадзяванні.**

**А ў беларускіх даследчыкаў днямі якраз было прафесійнае свята. Чым не нагода крыху перадыхнуць у памкненні да навуковых адкрыццяў і азірнуцца на тое, што зроблена? Найперш на ніве нацыянальнай. Бо ў сучасным мітуслівым свеце, дзе скрозь касмапаліты ды мігранты, так хочацца не забывацца на сваё, адчуваць уласную прыналежнасць да супольнасці — адметнай, непаўторнай, самабытнай.**

**І не толькі таму мы сёння даём слова гуманітарыям, што праблемы нацыянальнай культуры, мовы і літаратуры роднай газеце бліжэйшыя. Але яшчэ і таму, што «лірыкаў» часам незаслужана крыўдзяць. Маўляў, якая ад іх даследаванняў рэальная карысць? Давайце разбірацца. А дапаможа нам у гэтым дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ.**


Фота БЕЛТА.

Агульны культурны ўзровень яшчэ ніхто не адмяняў, і што, скажыце, мы рабілі б без нашых гуманітарыяў? Хто яшчэ ў свеце так шырока і глыбока вывучае беларускую культурную спадчыну, як не нашы навукоўцы? Мінулы год у даследчыкаў Інстытута выдаўся, між іншым, асабліва плённым:

— З'явілася цэлая серыя выданняў са збору твораў класікаў беларускай літаратуры — Якуба Коласа, Максіма Танка, Івана Шамякіна. Выйшлі значныя працы, прысвечаныя гісторыі беларускай літаратуры. Апублікавана некалькі манаграфій, прысвечаных даследаванню сучаснага літаратурнага працэсу і ролі літаратуры ў сучасным грамадстве. Пабачылі свет чарговыя тамы Гістарычнага і Этымалагічнага слоўнікаў беларускай мовы. Яны ствараюцца ў нашай краіне ўпершыню, маюць выключна важнае значэнне для развіцця гуманітарнай навукі і істотна ўздымаюць прэстыж беларускай лінгвістычнай навукі ў славянскім свеце.

### Неабходная і патрэбная ў сваёй краіне

Беларуская мова, да нашай уцехі, апошнім часам становіцца ўсё больш прыкметнай у краіне. Ёю ахвотна карыстаецца моладзь. Усё больш часта і ўпэўнена яна гучыць у дзяржаўных установах. А беларускамоўная рэклама сёння — увогуле модны трэнд. Выдатна! Абы толькі правільна гаварылі ды пісалі. І вось тут без навукоўцаў нікуды.

— Значна часцей да нас сталі звяртацца па кансультацыі, — расказвае кіраўнік Інстытута мовы і літаратуры. — Фарміруюцца беларускамоўныя сайты розных міністэрстваў і ведамстваў, зараз якраз дапамагаем стварыць такі Вышэйшаму Гаспадарчаму Суду. Наогул шмат прапаноў па праектах, звязаных менавіта з рэальным пашырэннем беларускай мовы ў розных сферах ужытку. Ёсць цікавасць да стварэння беларускіх галіновых тэрміналагічных слоўнікаў. Ужо ажыццёўлены пераклад на беларускую мову Агульнавоінскіх статутаў. Мы якраз падышлі да таго перыяду, калі на дзяржаўным узроўні пачынае звяртацца больш пільная ўвага менавіта на гуманітарныя праблемы, нацыянальныя прыярытэты. Сёння сапраўды можна заўважыць, што беларуская мова больш шырока прымяняецца ў тых афіцыйных сферах ужытку, дзе яна павінна выкарыстоўвацца як дзяржаўная мова краіны. Ёсць спецыяльная ўрадавая праграма па пашырэнні выкарыстання беларускай мовы ў розных сферах ужытку. І яе карысць ужо адчуваецца на практыцы. Беларуская мова зараз пачынае ўсведамляцца як неабходная і патрэбная.

Праграмныя палажэнні — гэта ўсё цудоўна, аднак, як кажуць, што можа быць лепш за... асабісты прыклад. Мінкульт перайшло на родную мову з лёгкай рукі свайго кіраўніка — Паўла Латушкі. Так што жыццёва неабходны нашай мове яшчэ і «піяр». Даследчыкі пераканаyя: найлепшым стымулам для павышэння аўтарытэту і прэстыжу беларускай мовы, пашырэння яе выкарыстання ў многіх сферах будзе з'яўляцца прыклад найбольш вядомых, аўтарытэтных, паважаных асоб краіны.

— А гэта і творчая інтэлігенцыя, і навукоўцы, і прадстаўнікі сферы дзяржаўнага кіравання. Чым больш мы будзем чуць беларускай мовы менавіта ад такіх асоб, тым больш яна будзе прывабнай для грамадзян нашай краіны, — мяркуе Аляксандр Лукашанец.

Многім патрэбны не проста ўзор для пераймання, а яшчэ і... кампанія. Куды лягчэй, пагадзіцеся, гутарыць з людзьмі на адной мове. Навукоўцы рэкамендуюць:

— Патрэбна пільная ўвага з боку ўсіх узроўняў нашага кіраўніцтва да стварэння беларускамоўнага фону. Чым больш мы будзем бачыць і чуць беларускую мову на вуліцах, ва ўстановах, тым з большай павагай да яе будуць ставіцца і радавыя карыстальнікі, тым лягчэй ім будзе яе выкарыстоўваць.

Дарэчы пра лёгкасць выкарыстання. Хто, як не навукоўцы, дапамагае нам камфортна пераходзіць на новы правапіс? Узброіўшыся распрацаванымі імі даведнікамі, засвойваць новае лёгка і проста.

### Прэстыжная за мяжой

Навукоўцы сваімі даследаваннямі падтрымліваюць мову не толькі ў сябе на радзіме, але і прапагандуюць яе за мяжой. Нядаўна Інстытутам сумесна з Саюзам беларусаў Латвіі ажыццёўлены грунтоўны праект па падрыхтоўцы да выдання «Беларуска-латышскага і латышска-беларускага слоўніка».

— Ён мае выключна важнае значэнне для пашырэння нашай мовы ў замежжы, — перакананы дырэктар Інстытута. А калі знаёмства з нацыянальнымі каштоўнасцямі выходзіць за межы краіны, гэта якраз сведчыць пра іх значнасць і важнасць у сусветным культурным асяроддзі.

У Латвіі выданне атрымала, кажуць, вельмі шырокі рэзананс.

— Яго прэзентацыя адбылася ў будынку Рыжскай думы з удзелам дэпутатаў Сейма, прадстаўнікоў іншых органаў дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання, грамадскасці. З прывітальным пісьмом да ўдзельнікаў прэзентацыі звярнуўся прэзідэнт Латвіі Валдзіс Затлерс. Ён адзначыў, што выданне такога слоўніка з'яўляецца важным крокам не толькі ў вывучэнні беларускай і латышскай моў, але і садзейнічанні нашым двухбаковым сувязям у сферы адукацыі, культуры і эканомікі.

Слоўнік, безумоўна, атрымаў прызнанне і ў Беларусі. Яго галоўны рэдактар Іван Лучыц-Федарэц удастоены прэміі НАН Беларусі за найлепшы міжнародны навуковы праект. І ў галіновым Інстытуце лічаць гэта абсалютна заслужаным:

— Выданне з'яўляецца яскравым прыкладам сапраўднай культурнай дыпламатыі. Сёння ў імклівым і дынамічным свеце вельмі важна захаваць менавіта гуманітарныя каштоўнасці, нацыянальныя культуры, мовы і літаратуры. Неабходна ведаць не толькі сваю спадчыну, але і іншых, перш за ўсё суседніх народаў. Толькі так можна больш даведацца адно пра аднаго і належным чынам ацаніць сваё.

**Ала МАЧАЛАВА.**

Спорт-тайм

## АЗАРАНКА ЗАСТАЕЦЦА 9-Й

Вікторыя Азаранка, якая, нагадаем, на Адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі ў адзіночным разрадзе дайшла да 1/8, захавала ў сусветным рэйтынгу 9-е месца. Яна перамагла немку Верле, чэшку Главачкаву і паўднёваафрыканку Шыперс. А шлях у чвэрцьфінал ёй заступіла кітаянка На Лі, якая дайшла да фіналу. У фінале крыўдзіцельніцу Вікторыі абыграла Кім Клійстэрс, якая, дзякуючы перамозе на турніры, паднялася на другі радок рэйтынгу. Узначальвае яго па-ранейшаму датчанка Каралін Вазняцкі.

У парным разрадзе Вікторыя разам з расіянкай Марыяй Кірыленкай дайшла да фіналу. Дзякуючы гэтаму ў парным рэйтынгу наша тэнісістка паднялася з 44-га на 25-е месца.

## ЛЮБОЎ ЧАРКАШЫНА ВЫЙГРАЛА ЭТАП КУБКА СВЕТУ


pressball.by

На першым у сёлетнім сезоне этапе Кубка свету па мастацкай гімнастыцы шматбор'е выйграла наша Любоў Чаркашына *(на фота)*. Трэба адзначыць, што на турнір, які прайшоў у канадскім Манрэалі, не прыехалі многія прымы гэтага віду спорту, у прыватнасці лідары расійскай каманды, а таксама наша прыма Меліта Станюта. Іх дастойна замянілі беларускі: са 107, 225 бала Любоў Чаркашына лідзіравала ў шматбор'і, а другое месца заняла яшчэ адна прадстаўніца нашай зборнай Аляксандра Наркевіч. Трэцяй стала расіянка Маргарыта Мамун.

У асобных практыкаваннях беларускі занялі яшчэ 7 прызавых месцаў. Аляксандра Наркевіч стала лепшай у практыкаваннях з булавамі і стужкай, а ў кампазіцыі з абручом заняла другое месца. А Чаркашына паказала другі вынік у практыкаваннях з мячом, булавамі і стужкай, а ў кампазіцыі з абручом стала трэцяй.

## ДЗЮДАІСТ АЛЯКСЕЙ РАМАНЧЫК ЗАВАЯВАЎ СЕРАБРО

На этапе Кубка свету па дзюдо, які прайшоў у Тбілісі, беларуская зборная заваявала сярэбраны медаль. Ён на рахунку Аляксея Раманчыка, які выступае ў вагавай катэгорыі 73 кг. У вырашальным паядынку спартсмен саступіў грузінскаму дзюдаісту Амбака Аваліяні. Акрамя таго, наш дзюдаіст адолеў турка Хасана Ілмаза, расіяніна Мікіту Хамянтоўскага, грузіна Зураба Назадзэ і эстонца Кунтэра Ротберга.

## НА УНІВЕРСІЯДЗЕ ЗАВАЯВАНЫ НАШ ПЕРШЫ МЕДАЛЬ

Першую ўзнагароду на сёлетняй зімовай Універсіядзе, якая праходзіць у Эрзуруме (Турцыя), заваявала біятланістка Дар'я Юркевіч. У індывідуальнай гонцы на 15 км з чатырма агнявымі рубяжамі яна заняла трэцяе месца. Дар'я пераадолела дыстанцыю за 49 хв. 09.9 сек, дапусціўшы адзін промах і саступіўшы 56,3 сек. пераможцы Дар'і Віралайнен з Расіі. Сярэбраным прызёрам стала немка Францыска Хільдэбранд. Астатнія нашы ўдзельніцы размеркаваліся наступным чынам: Ірына Бабецкая — 12-я, Ірына Нафрановіч —14-я, Настасся Дубарэзава — 18-я. Усяго ў гонцы прынялі ўдзел 40 біятланістак. У мужчынскай індывідуальнай гонцы на 20 км лепшым з беларусаў стаў Яўген Абраменка, які заняў 4-е месца.

На Універсіядзе беларусы выступяць у сямі відах спорту: біятлоне, гарналыжным спорце, фрыстайле, хакеі, шорт-трэку, лыжных гонках і фігурным катанні. Усяго ж на Сусветных студэнцкіх гульнях прымаюць удзел спартсмены больш як з 50 краін. Яны будуць спаборнічаць у 11 відах спорту і разыграюць 64 камплекты медалёў.

**Алена КРАВЕЦ.**

Хакей. КХЛ

## І рэкорда было мала

**«Мінск-Арэна» ўсталявала рэкорд, пераўзысці які бліжэйшым часам не атрымаецца ні ў каго, акрамя самой «Мінск-Арэны». На матчы рэгулярнага чэмпіянату КХЛ паміж мінскім «Дынама» і маскоўскім «ЦСКА» прысутнічала 15.576 гледачоў — найбольшая колькасць за ўсю трохгадовую гісторыю лігі.**


Фота БЕЛТА.

Заўзятары на трыбунах былі хіба што самай светлай плямай паядынку «зуброў» супраць гасцей са сталіцы Расіі. На працягу ўсяго матча яны падтрымлівалі сваю каманду, аднак хакейнае шчасце чарговы раз выбрала не «бела-блакітную» афарбоўку.

«Дынама» распачало гульню сваімі атакамі. Канадзец Корса ўжо на 5-ай хвіліне здолеў дабіць шайбу ў вароты пасля таго, як яе выпусціў з пальчаткі галкіпер гасцей. Аднак радасць была кароткачасовай: суддзя свіснуў за імгненне раней. Гаспадары працягвалі шукаць дарогу да «чужых» варот, а пра свае на некалькі секунд забыліся. І «армеец» Паршын скарыстаўся адным з нешматлікіх момантаў каля варот Мезіна. Праўда, беларусы адказалі хутка. Корабаў кідаў здалёк, Варламаў дабіваў з «пятачка» — 1:1. Другі перыяд таксама адзначыўся дзвюма, па адной у кожныя вароты, шайбамі. Спачатку «зубры» няўдала дзейнічалі ў абароне пры гульні ў меншасці і ўсё той жа Паршын добрай перадачай дазволіў Суглобаву расстрэльваць пусты вугал варот. А потым ужо «бела-блакітныя» канадцы Плат і Корса чарговы раз прадэманстравалі сваё майстэрства: галявы кідок лепшага галеадора мінчан Плата ледзь не нанёс шкоды сетцы ў варотах.

Падчас трэцяй дваццаціхвілінкі ў Мінск прыляцелі навіны аб тым, што галоўны канкурэнт «дынамаўцаў», ніжагародскае «Тарпеда», перамагло ў матчы з «Нафтахімікам». Гэта азначала, што мінчанам яшчэ больш патрэбна старацца перамагчы ў асноўны час. Аднак, нягледзячы на 13 (супраць чатырох гасцявых) кідкоў па варотах «ЦСКА» ў трэцім перыядзе, лік так і застаўся нічыйным — 2:2.

Авертайм і буліты апошнім часам беларускай камандзе не атрымоўваецца выйграць. Вось і ў нядзелю ў дадатковай пяціхвілінцы гаспадары, здавалася, толькі пачалі шукаць шанц каля варот «ЦСКА», аднак Корса непатрэбным выдаленнем прымусіў працаваць у напружаным рэжыме Мезіна. Галкіпер зборнай сваю задачу выканаў паспяхова. Выратоўваў Мезін у серыі булітаў. Са сваім калегам Валікетам яны на пару адбілі 7 кідкоў з 8. І, на жаль, адзіны прапушчаны гол прыйшоўся на долю беларуса.

Тым самым задачу выхаду ў плэй-оф «Дынама» зрабіла для сябе яшчэ цяжэйшай. «Бела-блакітныя» пакуль займаюць восьмае месца, аднак «Тарпеда» саступае толькі адзін бал. Пры тым, што ніжагародцы правялі пакуль на два матчы менш. Тры апошнія паядынкі ў рэгулярным сезоне, якія і вырашаць далейшы лёс каманды, «зубры» правядуць пасля міжнароднай паўзы, падчас якой хакеісты раз'язджаюцца па сваіх зборных.

**Яўген ВАРАКСА.**

Абзац

◢ **Летась 30 мінскіх сем'яў — даўжнікоў па аплаце жыллёва-камунальных паслуг — перасеелены ў жыллё меншай плошчы. За год у сталіцы пададзена 19 843 іскі аб прымусовым спагнанні запазычанасці, 332 іскі на высяленне.**

◢ **Легкавы аўтамабіль Renault, які ехаў па праспекце Незалежнасці ў раёне плошчы Перамогі, нечакана выехаў на тратуар непадалёк ад аўтобуснага прыпынку, зачапіў слуп ліхтара, праехаў праз газон і спыніўся, урэзаўшыся ў будынак. Медыкі, што прыехалі на месца ДТЗ, канстатавалі смерць кіроўцы, прычына якой устанаўліваецца. Як мяркуецца, кіроўцы стала дрэнна падчас руху і ён страціў прытомнасць. Побач з ім ехала яго дачка. Яна спрабавала пазбегнуць аварыі, вывернуўшы руль. Ніхто, акрамя кіроўцы, не пацярпеў.**

◢ Супрацоўнікі камунальнага дарожна-будаўнічага прадпрыемства падазраюцца ў крадзяжы бітуму больш чым на Br1 млрд, паведаміў учора на прэс-канферэнцыі начальнік УУС Магілёўскага аблвыканкама Фёдар Балейка. Па яго словах, арыштаваныя тры кіраўнікі камерцыйных структур, праз якія быў наладжаны працэс «адмывання» грошай. Пасля аплаты бітум паступаў на філіялы прадпрыемства не ў поўным аб'ёме, як па дакументах, а часткова. Аб'ёмы паставак будматэрыялаў былі немаленькія, адпаведна — і сумы, што клаліся ў кішэню. У дачыненні супрацоўнікаў філіялаў прадпрыемства заведзена 22 крымінальныя справы. Следства працягваецца.

◢ **Каля 147 млн чалавек у свеце пакутуюць ад высокага ўтрымання халестэрыну ў крыві, гаворыцца ў новым даследаванні Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Штогод 17 млн чалавек паміраюць з-за сардэчна-сасудзістых захворванняў, звязаных з павышаным узроўнем халестэрыну ў крыві.**

### Поўны абзац

◢ Жыхарка Малдовы нарадзіла адразу пяцярых дзяцей — трох хлопчыкаў і дзвюх дзяўчынак. Шчаслівай мамай стала 37-гадовая жыхарка сяла Гыждыены Гладзянскага раёна, у якой гэта былі трэція роды. У яе было ўжо двое дзяцей — сын 17 гадоў і 10-гадовая дачка. Усе нованароджаныя маюць вагу ад 700 г да 1 кг. Немаўляты нарадзіліся 6-месячнымі і знаходзяцца пад назіраннем урачоў у інкубатары. Нараджэнне пяці малых стала сюрпрызам для маці, бо яна чакала чацвярых.

◢ **У самагоншчыка з вёскі Брага адабралі 1,7 тыс. л прадуктаў з утрыманнем спірту. Дзве самыя буйныя за апошнія гады падпольныя кропкі па вырабе самагонкі ліквідаваныя ў Іўеўскім раёне. У прыватнасці, у хляве жыхара вёскі Брага быў знойдзены самагонны апарат, каля 1 тыс. л брагі, 30 л гатовага прадукту. Яшчэ 700 л самагону, разлітага ў пластыкавыя бутэлькі і мяшкі, праваахоўнікі выявілі ў памяшканні для захоўвання гародніны. А ў жыхара вёскі Лелюкі канфіскавана больш за 2 тыс. л брагі і 400 л самаробнай гарэлкі. Затрыманы захоўваў «гаючы» напой у спецыяльных дубовых бочках і пераконваў праваахоўнікаў, што нарыхтаваў прадукцыю выключна для ўласных патрэб. Парушальнікам пагражае сур'ёзны штраф.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## ЗМЕНЕНА МЕРА СТРЫМАННЯ АДНОСНА НЕКАТОРЫХ АБВІНАВАЧВАНЫХ У МАСАВЫХ БЕСПАРАДКАХ 19 СНЕЖНЯ Ў МІНСКУ

Грунтуючыся на выніках праведзеных раней следчых мерапрыемстваў, устанаўленні асноўных акалічнасцяў крымінальнай справы па факце масавых беспарадкаў у Мінску 19 снежня, ролі кожнага з абвінавачваных і іх лініі паводзін, следствам, па ўзгадненні з органамі пракуратуры, прынята рашэнне аб змяненні меры стрымання адносна У. Някляева. А. Корбана, А. Паўлава, У. Кобеца і С. Вазняка. Аб гэтым **БЕЛТА** паведамілі ў ЦІГС КДБ Беларусі. Акрамя таго, па гэтых і іншых падставах зменена мера стрымання адносна І. Халіп і Н. Радзінай. У. Някляеў і І. Халіп знаходзяцца пад хатнім арыштам з утрымліваннем пад аховай.

## Кішэннік — дзяўчына

Ну і ну!

У Віцебску ля аўтавакзала пад вечар на прыпынку грамадскага транспарту пры пасадцы на аўтобус гарадскога маршрута ў жыхаркі вёскі Ходцы Сенненскага раёна з сумачкі скралі кашалёк з грашыма. Жанчына звярнулася па дапамогу ў міліцыю. Вельмі хутка знайшлі кішэнніка... З доказамі злачынства затрымалі 23-гадовую раней судзімую жыхарку абласнога цэнтра. І не вельмі яна абагацілася: страту пацярпелая ацаніла ў 95 тысяч рублёў. Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### Як сцёкавыя воды пераўтвараць у даходны біягаз

На Бабруйскім гідролізным заводзе рэалізаваны праект па атрыманні біягазу з адходаў вытворчасці тэхнічнага спірту.

Падобныя тэхналогіі і абсталяванне ў Беларусі не ўжываліся, таму праект з'яўляецца доследна-эксперыментальным. Біягаз атрымліваюць са сцёкавых вод, якія падвяргаюць браджэнню з дапамогай спецыяльных бактэрый.

Эканамічны эфект біягазавага праекта — 200 тысяч долараў у год. Больш за тое, завод можа знізіць на трэць ужыванне прыроднага газу.

**Ілона ІВАНОВА.**

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 04 марта 2011 года**

**ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже единым лотом принадлежащего ЗАО «Минский инструментальный завод» (продавец) имущества оздоровительного лагеря «Восток», расположенного по адресу: Минская область, Минский район, Острошицко-Городокский с/с, западнее д. Острошицкий Городок.**

**В состав лота входит следующее имущество:**

| № п/п | Наименование и характеристики продаваемого имущества |
|---|---|
| 1. | Корпус № 1 – клуб (здание специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения) площадью 389,4 кв. м, инв. номер 600/С-120065 |
| 2. | Корпус № 2 (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) площадью 152,0 кв. м, инв. номер 600/С-120064 |
| 3. | Корпус № 3 (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) площадью 144,8 кв. м, инв. номер 600/С-120063 |
| 4. | Корпус № 4 (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) площадью 148,5 кв. м, инв. номер 600/С-120062 |
| 5. | Корпус № 5 (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) площадью 199,2 кв. м, инв. номер 600/С-120061 |
| 6. | Корпус (8 комнат) № 6 (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) площадью 229,2 кв. м, инв. номер 600/С-120060 |
| 7. | Корпус (8 комнат) № 7 (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) площадью 211,6 кв. м, инв. номер 600/С-120059 |
| 8. | Корпус хозяйственный (здание нежилое) площадью 90,3 кв. м, инв. номер 600/С-120056 |
| 9. | Кухня-склад (здание специализированное для общественного питания) площадью 31,1 кв. м, инв. номер 600/С-120057 |
| 10. | Столовая (здание специализированное для общественного питания) площадью 388,3 кв. м, инв. номер 600/С-120052 |
| 11. | Цех предварительной очистки картофеля (здание нежилое) площадью 22,3 кв. м, инв. номер 600/С-120055 |
| 12. | Овощехранилище с подвалом (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 91,7 кв. м, инв. номер 600/С-120058 |
| 13. | Медпункт (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) площадью 127,7 кв. м, инв. номер 600/С-120054 |
| 14. | Спальный корпус на 72 места (незавершенное законсервированное капитальное строение) площадью 1584,4 кв. м. |

Имущество, входящее в состав лота, расположено на земельном участке площадью 5,1124 га, кадастровый номер 623685206101000889.

Начальная цена – 1 060 648 000 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 100 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012037450010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 153001334; УНП 190398583. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый лот. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в срок, указанный в договоре купли-продажи, по согласованию с продавцом.

Аукцион состоится **04 марта 2011 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 02.02.2011 по 02.03.2011** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (ул. К. Маркса, 39, г. Минск);**
**(029) 110 90 02 – ЗАО «Минский инструментальный завод» (ул. Зм. Бядули, 13, г. Минск).**

**ЗАВЕРЕНО**
Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
__________А.Л.Гальперин
31 января 2011 г.

**УТВЕРЖДЕНО**
**Общим собранием Участников**
КСО «Внешэкономстрой» ООО
30 декабря 2010 года
(протокол № 38)

## КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

**об открытой продаже жилищных облигаций восемнадцатого, девятнадцатого, двадцатого и двадцать первого выпусков Коммерческой совместной организации «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью (КСО «Внешэкономстрой» ООО)**

**Раздел 1. Общие сведения об эмитенте**

**1. Наименование эмитента.**

На белорусском языке:

полное наименование: Камерцыйная сумесная арганізацыя «Знешэканомбуд» таварыства з абмежаванай адказнасцю;

сокращенное наименование: КСА «Знешэканомбуд» ТАА.

На русском языке:

полное наименование: Коммерческая совместная организация «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью (далее по тексту – эмитент);

сокращенное наименование: КСО «Внешэкономстрой» ООО.

**2. Место нахождения эмитента:** 220004, Республика Беларусь, г. Минск, пр. Победителей, д. 23, к. 3, оф. 208А; **телефон**: (017) 218 15 56; **факс**: (017) 218 15 55; **электронный адрес** (e-mail): market@vnesheconomstroy.by.

**3. Основной вид деятельности эмитента:**

согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2006

701 – Операции с собственным недвижимым имуществом.

Эмитент вправе осуществлять функции заказчика (застройщика) согласно «Инструкции о застройщике, заказчике в строительстве», утвержденной приказом Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь 22 июня 1999 г. № 174 (с учетом изменений в действующей редакции).

**4. Номер расчетного счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи, наименование обслуживающего банка:** р/с № 3012004529008 в ОАО «Белвнешэкономбанк», г. Минск, ул. Мясникова, 32, код 226.

**5. Бухгалтерская отчетность** эмитента в составе, определенном пунктом 9 Инструкции о порядке представления отчетности и раскрытия информации участниками рынка ценных бумаг, утвержденной постановлением Комитета по ценным бумагам при Совете Министров Республики Беларусь от 16 декабря 2005 г. № 10/П «О некоторых вопросах представления отчетности и раскрытия информации участниками рынка ценных бумаг», в соответствии с законодательством в периодическом печатном издании не публиковалась и ее опубликование не требуется.

**6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента**: Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк» (далее по тексту – депозитарий).

**Место нахождения** депозитария: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, ком. 607. Зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 12 декабря 1991 года, регистрационный номер 24.

Специальное разрешение (**лицензия**) № 02200/0247744 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выдано (продлена) Министерством финансов Республики Беларусь депозитарию на основании решения от 13 июля 2007 года № 243 сроком на 5 лет и действительна до 29 июля 2012 года.

**7. Размер уставного фонда эмитента:** 1 197 275 (Один миллион сто девяносто семь тысяч двести семьдесят пять) долларов США (уставный фонд сформирован в размере 100 %).

**8. Дата и номер государственной регистрации эмитента, наименование органа, его зарегистрировавшего.**

Коммерческая совместная организация «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью **зарегистрировано** Министерством иностранных дел Республики Беларусь 15 августа 2002 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 800015707.

**9. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии.**

Ознакомиться с Проспектом эмиссии облигаций можно ежедневно (кроме выходных и нерабочих праздничных дней) с 9.00 до 12.30 и с 14.00 до 15.00 (в пятницу, а также в дни, предшествующие выходным и праздничным дням, объявленным нерабочими, с 9.00 до 12.30) начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций:

- в КСО «Внешэкономстрой» ООО по адресу: г. Минск, пр. Победителей, д. 23, к. 3, оф. 208А;

- в ОАО «Белвнешэкономбанк» по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 607.

**10. Решение о выпуске жилищных облигаций восемнадцатого, девятнадцатого, двадцатого и двадцать первого выпусков** принято 30.12.2010 года на внеочередном Общем собрании Участников (**протокол № 38**).

**11. Объем эмиссии жилищных облигаций составляет:**

**восемнадцатого** выпуска – 918 450 000 (Девятьсот восемнадцать миллионов четыреста пятьдесят тысяч) белорусских рублей;

**девятнадцатого** выпуска – 890 110 320 (Восемьсот девяносто миллионов сто десять тысяч триста двадцать) белорусских рублей;

**двадцатого** выпуска – 610 093 990 (Шестьсот десять миллионов девяносто три тысячи девятьсот девяносто) белорусских рублей;

**двадцать первого** выпуска – 2 626 680 000 (Два миллиарда шестьсот двадцать шесть миллионов шестьсот восемьдесят тысяч) белорусских рублей.

**Количество** жилищных облигаций:

**восемнадцатого** выпуска – 157 (Сто пятьдесят семь) штук;

**девятнадцатого** выпуска – 129 (Сто двадцать девять) штук;

**двадцатого** выпуска – 83 (Восемьдесят три) штуки;

**двадцать первого** выпуска – 318 (Триста восемнадцать) штук.

**12. Номинальная стоимость одной жилищной облигации:**

**восемнадцатого** выпуска – 5 850 000 (Пять миллионов восемьсот пятьдесят тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 2-ой категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске);

**девятнадцатого** выпуска – 6 900 080 (Шесть миллионов девятьсот тысяч восемьдесят) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 5-ой категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске);

**двадцатого** выпуска – 7 350 530 (Семь миллионов триста пятьдесят тысяч пятьсот тридцать) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 8-ой категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске);

**двадцать первого** выпуска – 8 260 000 (Восемь миллионов двести шестьдесят тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилых помещений (квартира № 321, 20 эт., 3-я секция и квартира №326, 21 эт., 3-я секция) в Многофункциональном комплексе по проспекту Победителей, 27 в г. Минске).

**13. Открытая продажа (размещение)** жилищных облигаций проводится **с 2 февраля 2011 года и по 23 марта 2012 года**.

**14. Срок обращения облигаций с 2 февраля 2011 года по 31 марта 2012 года включительно (424 календарных дня).**

**15. Проведение открытой продажи (размещения)** жилищных облигаций осуществляется ОАО «Белвнешэкономбанк» ежедневно (кроме субботы и воскресенья, а также за исключением государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 9.00 до 12.30 и с 14.00 до 15.00 (в пятницу, а также в дни, предшествующие выходным и праздничным дням, объявленным нерабочими, с 9.00 до 12.30) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 607.

**16. Облигации зарегистрированы** Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 31 января 2011 года.

Регистрационный номер: «ВЭС – 18» 5-200-02-0978.
Регистрационный номер: «ВЭС – 19» 5-200-02-0979.
Регистрационный номер: «ВЭС – 20» 5-200-02-0980.
Регистрационный номер: «ВЭС – 21» 5-200-02-0981.

УНП 800015707.

# ГАЛОЎНЫ СПЕЦЫЯЛІСТ ПА «ВАЧАХ»

## У яго слоўніку зафіксавана каля тысячы эпітэтаў да гэтага назоўніка



**ДНЯМІ пісьменніку Міхасю Пазнякову, лаўрэату некалькіх літаратурных прэмій, выдатніку друку Беларусі споўнілася 60 гадоў. Паэт распавёў «Звяздзе» пра свой шлях ад навукі да літаратуры і пра тое, як любоў да Багдановіча перамагла.**

**Большасці з нас Міхась Пазнякоў вядомы як дзіцячы паэт, перакладчык «Дон Кіхота» Сервантэса на беларускую мову (праўда, праз рускую) і аўтар першага слоўніка беларускіх эпітэтаў. Усё жыццё Міхасю Паўлавічу шчасціла займаць яшчэ і высокія пасады. Цяпер, напрыклад, ён старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

***— Міхась Паўлавіч, як атрымалася, што вы такі «шматпрофільны» пісьменнік: дзіцячыя вершы, інтымная і патрыятычная лірыка, гумар, сатыра, проза, пераклады, літаратурная крытыка, мовазнаўства?***

— Я з былых настаўнікаў мовы і літаратуры ў школе. Мне заўжды хацелася нешта такое адметнае ствараць не толькі для дарослых, але і для дзяцей. У мяне на сёння ўжо вельмі шмат кніг, недзе 30, можа, крыху і больш. Гэта гледзячы што ўлічваць. Я пераклаў вельмі шмат твораў замежных пісьменнікаў на беларускую мову і беларускіх твораў пісьменнікаў — на рускую мову. На беларускую мову пераклаў, напрыклад, раман Сервантэса «Дон Кіхот». Вядома, славуты такі раман, — гэта было вельмі прэстыжна, хоць і вельмі цяжка. Я іспанскай мовы не ведаю. Але ёсць яшчэ шлях — перакладаць праз рускую мову. І ў мяне быў выдатны кансультант, які добра ведаў іспанскую мову і культуру. У мяне было да яго вельмі-вельмі шмат пытанняў, старонак 20 адных толькі пытанняў, удакладненняў. Яны былі патрэбныя, каб перакласці дакладна, таму што ў рускім варыянце сустракаліся нейкія недахопы і таму ўзнікалі пытанні...

Так складвалася, што я пачаў пісаць з шостага класа на рускай мове. Пісаў проста так для сябе, для сяброў. І далей па жыцці пісаў пераважна вершы для дарослых. Аднойчы я даведаўся, што аб'яўлены конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады малодшага навуковага супрацоўніка Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук. Рызыкнуў, сабраў свае публікацыі і прайшоў. Там ужо я адчуў, што такое мова, літаратурная лексіка, народная лексіка, розныя пласты гаворак, літаратурнай мовы, адчуў прафесійны падыход да слова. Я працаваў пад кіраўніцтвам такіх карыфеяў, як акадэмікі Аркадзь Жураўскі, Кандрат Крапіва. Удзельнічаў у распрацоўцы руска-беларускага і беларуска-рускага слоўнікаў. Тады я і пачаў пісаць мовазнаўчыя навуковыя артыкулы, друкавацца ў такіх выданнях, як «Полымя», «Літаратура і мастацтва», у выданнях Акадэміі навук, навуковых зборніках. Багацце мовы падштурхнула мяне да пошукаў новых формаў. Пасля так атрымалася, што я працаваў над стварэннем музея Максіма Багдановіча, і, безумоўна, творчасць гэтага таленавітага чалавека не магла не даць новы павеў маёй уласнай творчасці. А праз некаторы час перайшоў на працу ў выдавецтва «Юнацтва», дзе 10 гадоў быў галоўным рэдактарам. Гэта прымусіла задумацца над тым, што варта было б пачаць пісаць і нешта дзіцячае. Пісаць для дзяцей я пачаў падчас працы ў «Юнацтве», у мяне ўжо былі свае малыя дачка і сын. Кожны вечар я клаў дзяцей спаць і чытаў ім нейкія казкі. Але дзеці часта прасілі выключыць святло. У цемры ж чытаць немагчыма. І я пачаў сам фантазіраваць, прыдумляў казкі, дзе героямі былі яны. А пасля стаў гэта запісваць. Потым пачаў вершы для дзяцей пісаць. Першую кніжачку мы з дачушкай зрабілі — «Родны край». Яна малюнкі намалявала, вершы мы на машынцы надрукавалі, сашчэпкамі замацавалі — і атрымалася кніжачка! А пасля я стаў друкаваць свае вершы ў «Зорцы», «Раніцы», «Бярозцы», «Вясёлцы». Паколькі я мовазнавец, не мог не скарыстаць свае веды і напісаў кніжачку «Дзіўныя «блізняты». Гэта загадкі на беларуска-рускія амонімы — упершыню ў гісторыі сусветнай літаратуры (мне такое больш нідзе не сустракалася). Хоць гэта ўнікальная з'ява паміж беларускай і рускай мовамі. Такое маглі ствараць толькі рускія альбо беларусы. Потым выходзілі «Загадкі з поля і градкі», «Падарожжа ў краіну загадак». Я напісаў каля 700 загадак! Яшчэ я ўпершыню стварыў загадкі на антонімы. Пісаў калыханкі, скорагаворкі, каламбуры, нават дражнілкі, лічылкі, смяшынкі. А гэта вельмі дзятва любіць. Адна кніжка ў мяне выходзіла ў 1991 годзе «Тры чарадзеі» — тыражом 120 тыс. экзэмпляраў. Сёння гэта нерэальна. Калі б я кніжку гэтую не паказаў, то мне б ніхто не павервыў. Але ў той час дзіцячыя кніжкі былі запатрабаваныя — яны ішлі ва ўсе бібліятэкі, крамы. І гэта на беларускай мове толькі па Беларусі разыходзіўся такі вялікі тыраж! А «Юнацтва» ж выдавала кнігі на 18 замежных мовах для 110 краін свету! Так мы распаўсюджвалі беларускую літаратуру, перакладалі нашых пісьменнікаў для еўрапейскіх краін, Японіі, В'етнама, Індыі, Амерыкі, Афрыкі!

***— Раскажыце падрабязней пра ваш слоўнік эпітэтаў.***

— Падчас працы ў Акадэміі навук я пачаў працу над сваім фундаментальным слоўнікам эпітэтаў беларускай літаратурнай мовы, які быў выдадзены ў 1988 годзе. Прайшло 23 гады з таго часу. Перавыданне будзе толькі ў гэтым годзе ў 2 тамах у РВУ «Літаратура і мастацтва». Я дапоўніў слоўнік: калі ў першым выданні было крыху больш за 400 найбольш ужывальных назоўнікаў, да якіх былі пададзены эпітэты, то цяпер назоўнікаў будзе больш за 450. Гэтае выданне дапрацаванае і пашыранае... Вось, напрыклад, да слова «вочы» зафіксавана ў мяне каля тысячы эпітэтаў. Я перачытваў усю літаратуру, публіцыстыку, перыёдыку і распісваў на вялізную картатэку. Картатэка — гэта сотні-сотні тысяч картачак з эпітэтамі. Пасля гэтая інфармацыя вывучалася, аналізавалася. Як гэтыя эпітэты падзяліць? Я выкарыстоўваў вопыт расійскіх калег — там цэлы калектыў працаваў над слоўнікам эпітэтаў рускай мовы. А я зрабіў гэтую працу адзін. Я падзяліў эпітэты па семантычных групах: якія бываюць вочы? Па колеры, па форме, па параўнанні з жывёламі, птушкамі: валовыя вочы, рыбіны вочы, звярыныя вочы і г.д., па эмацыйнай экспрэсіі, па выказванні пачуцця...

***— Як так атрымалася, што менавіта вам даручылі ствараць музей Максіма Багдановіча?***

— Падчас працы ў Акадэміі навук у Інстытут мовазнаўства прыйшоў ліст з Міністэрства культуры. Міністрам быў тады Юрый Міхайлавіч Міхневіч. У канцы 1980 г. яны шукалі маладога хлопца, каб прызначыць яго ствараць музей Максіма Багдановіча. Дырэктар Інстытута мовазнаўства Міхаіл Раманавіч Суднік прапанаваў мяне. Я тады, вядома, расхваляваўся, бо перада мной была кар'ера навукоўца, але ўсё ж такі перамагла мая любоў да літаратуры, да Багдановіча! Хто быў абыякавы да творчасці гэтага паэта! Увогуле, чалавека-энцыклапедыста, чалавека незвычайнага. Карацей, мне выдалі пасведчанне, што я з'яўляюся дырэктарам літаратурнага музея Багдановіча. Але ў мяне не было нічога! Ні штату, ні памяшкання, ні экспанатаў! Трэба было ўсё шукаць, распрацоўваць! Гэта тытанічная праца. Тады я ўпершыню ўсур'ёз сутыкнуўся з чынавенствам на ўсіх узроўнях.

***— Чыноўнікі — людзі складаныя... Ці былі ў вас нейкія непаразуменні з імі падчас працы над музеем?***

— Былі, безумоўна, былі... Напрыклад, я дабіваўся зрабіць памятны медаль да юбілею, значок. І мне здавалася, што без гэтага нельга. А для вышэйшых чыноўнікаў (гэта ж праз Савет Міністраў, праз ЦК даводзілася прабіваць) гэта здавалася не так істотна: няма сродкаў, гэта не запланавана... Раней жа было ўсё планава. Каб распачаць нейкую справу, трэба, каб у планах гэта было закладзена за год-два. Каб пачаць рэстаўрацыю, павінны быць выдзелены ліміты на будаўнічыя матэрыялы, закладзены фінансы... І даводзілася чуць: а хто прыдумаў гэтага сухотнага? Навошта гэта ўспамінаць, навошта гэты музей рабіць? Некаторыя чыноўнікі так казалі, былі такія... Хоць на самым высокім узроўні ўсё было на паперах прынята, зацверджана: Савет Міністраў, Міністэрства культуры, ЦК партыі... Лягчэй за ўсё на паперы стварыць! Вось сёння прынялі б пастанову — стварыць у Мінску музей Максіма Танка ці Івана Шамякіна. На паперы лёгка стварыць! А пасля?!

***— Вы выдатна ведаеце нямецкую мову, шмат казак з яе перакладалі. Хочацца з гэтай нагоды ўзгадаваць вядомага перакладчыка з нямецкай Васіля Сёмуху: ці супрацоўнічалі вы, ці канкурыравалі?***

— Не, не канкурыравалі. Я перакладаў Гофмана, Андэрсэна, братоў Грым — казкі, на вялікія творы ў мяне не было часу, я вельмі быў заняты як чыноўнік. А Васіль Сёмуха заўжды перакладаў вялікія творы: аповесці, раманы. Таму нашы сферы інтарэсаў, так бы мовіць, не перакрыжоўваліся. З Сёмухам мы супрацоўнічалі, калі я ўзначальваў «Юнацтва»: ён шмат чаго для нас перакладаў. А нам, наадварот, заўжды не хапала перакладчыкаў. Якая там канкурэнцыя!

***— Наколькі сёння, у час глабалізацыі і змены каштоўнасцяў, важная нацыянальная мова? Як, на вашу думку, беларусам у такі складаны час не анямець?***

— Так, час цяпер складаны. Іншы раз сустракаюцца маладыя людзі, якія размаўляюць па-руску, а крычаць, што яны за Беларусь! Я лічу: па-першае, калі вы за Беларусь, дык пачніце з сябе, пачніце вывучаць нашу мову, нашу культуру, паважаць наш народ, яго выбар. Па-другое, сапраўдныя беларусы — шчырыя, талерантныя, уважлівыя, і сапраўдны беларус ніколі не будзе адмаўляць нічога суседскага. Вось паглядзіце на прыбалтыйскія краіны: у іх зараз столькі праграм, каб перакладаць сваю літаратуру, рухаць сябе ў шырокі свет! Таму нам, безумоўна, трэба шануючы сваё, вывучаючы сваё, пераймаць усё лепшае з сусветнага вопыту. А наогул, трэба больш актыўна прапагандаваць беларускую мову ва ўсім грамадстве! Трэба спакойна, разважліва ў сваёй душы разабрацца. Трэба, каб кожны адчуў, што ён сапраўды беларус — не толькі па пашпарце. Па культуры, па духу, па думках, што ён належыць да такога вялікага народа, што ў гэтага народа такая вялікая культура, такая цудоўная гісторыя. Трэба, каб моладзь больш чытала па-беларуску, думала па-беларуску. Свету мы больш цікавыя нашай культурай, нашым мастацтвам, духоўнасцю. Калі розныя спажывецкія тавары могуць вырабіць дзе заўгодна, то беларускую кнігу могуць стварыць толькі ў Беларусі!

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**





Фота Васіля ЗЯНЬКО.

Альбуць, Смольня, Ласток — гэтыя мясціны Стаўбцоўшчыны сваім маляўнічым, непаўторным хараством люлялі, песцілі дзяцінства Якуба Коласа. Зараз гэта ўлонне заўсёды лагодзіць успамін і погляд Міхася Міцкевіча — сына вялікага песняра, акадэміка Акадэміі навук Беларусі, якому ў гэтую адбеленую снегавым пухам пару, а менавіта 31 студзеня, споўнілася 85 гадоў.

## Навіны сталіцы

### Прырастае Мінск крамамі

**Зараз у сталіцы налічваецца 915 харчовых крамаў.**

Паводле слоў начальніка аддзела арганізацыі гандлю галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Тамары Ціханавай, у горадзе створаны ўсе ўмовы для свабоднай гандлёвай канкурэнцыі. Гандлёвая сетка Мінска развіваецца дынамічна, носіць сацыяльны кірунак і ўлічвае нацыянальны інтарэс.

На працягу мінулага года ў горадзе былі адчыненыя 222 гандлёвыя аб'екты, з іх 115 — крамы агульнай плошчай каля 40 тысяч квадратных метраў. Паводле слоў Тамары Віктараўны, гэта можна прыраўнаваць да шасці-сямі буйных гіпермаркетаў. На працягу гэтага года ў сталіцы плануецца адчыніць не менш за 200 гандлёвых аб'ектаў, што дазволіць стварыць яшчэ больш спрыяльныя ўмовы для продажу тавараў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### У сталіцы ў мінулым годзе павялічыўся продаж прадуктаў харчавання

Сумкі, з якімі мінчане і госці сталіцы летась вярталіся пасля паходаў па харчовых крамах, яўна пацяжэлі. Як паведамілі ў галоўным статыстычным упраўленні сталіцы, у 2010 годзе ў параўнанні з 2009-м продаж прадуктаў харчавання ў супастаўных цэнах узрос на 14,7%. У прыватнасці, мяса і птушкі прададзена на 9,8% больш, каўбасных вырабаў і вэнджаніны — на 7,2, рыбы і морапрадуктаў — на 11,7, мясных кансерваў — на 20,8, сыру — на 11,6, круп і бабовых — на 10,6, макаронных вырабаў — на 12,9, сокаў — на 17,2, безалкагольных напояў — на 17,8, кандытарскіх вырабаў — на 14,4%. У той жа час назіралася зніжэнне спажывання кансерваў і прэзерваў з рыбы і морапрадуктаў на 5,7%, жывёльнага масла — на 1,5, цукру — на 6,6%. Ажыццяўляючы пакупкі, мінчане аддавалі перавагу айчынным таварам. На долю прадуктаў харчавання беларускай вытворчасці прыпадала 77,3% аб'ёму рознічнага тавараабароту.

**Алег ПАХОЛКІН,** *«Мінск—Навіны».*

### Метрапалітэн чакае 5-мільярднага пасажыра

**У сакавіку або красавіку 2011 года колькасць перавезеных Мінскім метро пасажыраў пераадолее пяцімільярдны рубеж.**

Летась цягнікі сталічнай падземкі перавезлі 273 млн 580 тыс. пасажыраў, што амаль на 20 млн больш, чым годам раней. У 2009-м у сярэднім у суткі паслугамі сталічнага метро карысталася амаль 696,5 тыс. мінчан і гасцей горада, а ўжо ў 2010-м паказчык дасягнуў 750 тыс. чалавек.

**Магда КРЭПАК,** *«Мінск—Навіны».*

# НЕПАЗБЕЖНАСЦЬ ПАКАРАННЯ,

## або Хто павінен сядзець у турме?

**ПРАКУРОР Брэсцкай вобласці Сяргей ХМАРУК паклікаў журналістаў на прэс-канферэнцыю, якая прысвячалася вынікам работы органаў пракуратуры вобласці за 2010 год. Падчас гутаркі мы даведаліся, што летась у вобласці было здзейснена на 2,7% злачынстваў менш, чым у папярэднім годзе. Паменшылася колькасць злачынстваў, якія ўчынілі падлеткі, а таксама групы асоб. Крыху менш, як год таму, здзейснена цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў. І гэта ўсяляе пэўны аптымізм. Але разам з тым прагучала і такая лічба: на 10000 насельніцтва здзейснена 108 злачынстваў. Гэта значыць, на кожную сотню чалавек, у лік якіх уваходзяць немаўляты, дашкольнікі, старыя, нямоглыя, ляжачыя, прыпадае крыху больш за адно злачынства. Вось «званочак» у бок крымінальнасці і маральнасці нашага грамадства наогул і падстава для таго, каб яно, грамадства, больш дбала аб сваёй будучыні. Бо амаль кожны з нас, радавы ці пры пасадзе, у нейкі момант можа паспрыяць таму, каб папярэдзіць як капеечнае правапарушэнне, так і мільярдныя справы.**

Вядома, журналістаў найбольш цікавілі тыя самыя мільярдныя справы. Напрыклад, сітуацыя вакол будаўнічай кампаніі «Аблічча», якая фактычна абанкруцілася і пакінула сам-насам каля пяцісот брастаўчан. Апошнія ўнеслі розныя сумы грошай на будаўніцтва кватэр у дамах мікрараёна «Кавалёва» і ў цэнтры горада. Дамы стаяць недабудаванымі. Людзі, многія з якіх узялі крэдыты і ўнеслі да ста тысяч долараў за кватэру і пачалі тыя крэдыты выплачваць, не маюць сёння ўяўлення пра свой далейшы лёс. Некаторыя з іх падалі іскі ў суд з патрабаваннем вярнуць грошы. Суд іскі задаволіў. А кіраўніцтва «Аблічча» заяўляе, што грошай у арганізацыі няма. Людзі кінуліся ў органы ўлады, а там ім патлумачылі, што ААТ — гэта прыватная фірма, у якую дольшчыкаў ніхто сілай не пхаў.

Аўтар гэтых радкоў таксама прыглядалася да дома палепшанай планіроўкі, які ўзводзілі побач з вяслярным каналам, калі паўстала пытанне аб паляпшэнні жыллёвых умоў. Як адзін з варыянтаў мы з мужам разглядалі магчымасць заключыць дагавор з названай фірмай, сваю двухпакаёвую кватэру прадаць, узяць крэдыт, а на кароткі час зняць жыллё. Тэрміны здачы былі нават пазначаны на пашпарце аб'екта. Калі меркаваць па напісаным, да канца будоўлі заставаліся лічаныя месяцы. Цяпер нават страшна ўявіць, што было б, калі б мы спыніліся на гэтым варыянце. Былі б зараз з сям'ёй і без грошай, і без кватэры. Таму зразумелы адчай людзей, якія ходзяць па судах, па кабінетах, і ніхто ім не кажа, што будзе далей.

Апошнім часам вырашаецца пытанне наконт перадачы недабудаваных дамоў будтрэста № 8, адной з самых салідных будаўнічых фірмаў у горадзе. Але ўзнікае пытанне, за што будзе ўзводзіць трэст гэтыя дамы? Нават калі прадаць усю маёмасць «Аблічча», а частку грошай выдзеліць бюджэт, сродкаў не хопіць. А людзі не могуць уносіць значныя сумы звыш таго, што ўнесена. Нядаўна гаспадарчы суд вобласці адхіліў заяву ААТ «Аблічча» аб пачатку працэдуры банкруцтва. Такім чынам, суд абазначыў сваю пазіцыю: фірма павінна вынайсці сродкі, каб разлічыцца з даўгамі. Такой жа думкі прытрымліваецца і пракурор вобласці. Сяргей Хмарук сказаў, што зараз ідзе праверка дзейнасці гаспадарчага суб'екта праваахоўнымі органамі, хутка да іх падключыцца і Дзяржкантроль. Па выніках праверкі будуць зроблены высновы, ці ёсць у дзейнасці ААТ склад злачынства. Галоўнае, паводле слоў пракурора, прымусіць іх разлічыцца па даўгах, а прыцягнуць да адказнасці вінаватых у выпадку падстаў для гэтага, ніколі не позна.

Абмяркоўваліся на прэс-канферэнцыі і пытанні карупцыі. Аказалася, што ў 2010 годзе ў вобласці было выяўлена 346 злачынстваў карупцыйнай накіраванасці. З іх у сферы дзяржаўнага кіравання — 66 злачынстваў, 50 — у гандлі, 47 — у прамысловасці, 33 — у сельскай гаспадарцы, 22 — у будаўніцтве, 12 — у галіне аховы здароўя. Да карупцыйных правапарушэнняў адносяцца як дача хабару ў буйных памерах, так і выкарыстанне, скажам, службовага транспарту ў асабістых мэтах. І калі супрацоўнік Столінскай пракуратуры выступіў у мясцовай газеце, дзе напісаў, што паездка на абед на службовай машыне разглядаецца з прававога пункту гледжання як праява карупцыі, то артыкул той зрабіў сапраўдны фурор у раёне. Мабыць, нават спалохаліся службоўцы і нейкі час на абед пехатой хадзілі. Але добра і тое, што людзі былі праінфармаваныя. Цяпер у выпадку чаго ні ў каго не будзе нагоды сказаць, што не ведаў.

Недахоп інфармаванасці ў моладзевым асяроддзі адзначыў пракурор вобласці пасля сваёй сустрэчы з падлеткамі абласнога цэнтра, якія стаяць на ўліку ў міліцыі. Найбольш іх цікавіла, якія тэрміны зняволення пагражаюць за крадзеж, за бойку, іншае дробнае хуліганства. Значыць, да рызыкоўнага кантынгенту падлеткаў трэба даводзіць гэтую інфармацыю ўсімі сродкамі.

Цікава было таксама ведаць меркаванне брэсцкага пракурора наконт далейшага ўдасканалення сістэмы пакарання. Сяргей Канстанцінавіч лічыць, што пакаранне пазбаўленнем волі павінны вызначаць зыходзячы са ступені небяспекі для грамадства злачынства і асобы, што яго здзейсніла. У агульнай масе злачынстваў у вобласці цяжкія і асабліва цяжкія склалі 9,2%. Асобы, што іх здзейснілі, павінны сядзець у турме. А вось у дачыненні да астатніх трэба падыходзіць больш уважліва. Калі дзеянне асобы не ўяўляе пагрозы для грамадства, ёсць сэнс даць такому чалавеку магчымасць выправіць дапушчаную памылку. А кампенсаваць урон, нанесены дзяржаве, установе або грамадзяніну лепш і хутчэй за ўсё атрымаецца на працы, а не за кратамі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### Больш за 60 крадзяжоў з дачных дамоў адбылося сёлета ў Мінскай вобласці

**У 2010 годзе ў Мінскай вобласці адбыліся 983 крадзяжы з дачных дамоў, што на 203 менш, чым у 2009 годзе, паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі УУС Мінаблвыканкама Руслан Быліна.**

З пачатку гэтага года ў вобласці зафіксаваны 63 такія выпадкі. Так, 4 студзеня ў міліцыю звярнуўся грамадзянін і заявіў, што з 20 снежня 2010 года па 4 студзеня 2011 года хтосьці пранік у яго дачны домік, размешчаны ў вёсцы Шчокі Мінскага раёна. Зламыснік скраў газонакасілку і электрычны прывад электраплуга на агульную суму 1 200 000 рублёў. Заведзена крымінальная справа.

У УУС адзначылі, што ў зімовы час гараджане нячаста наведваюць свае загарадныя дамы, таму факт крадзяжу выяўляецца праз нейкі час, нярэдка толькі вясной. Гэта значна ўскладняе раскрыццё злачынства. Міліцыянеры раяць дачнікам абсталяваць уваходныя дзверы дамоў надзейнымі замкамі, на вокны ставіць краты. Таксама можна абзавесціся аўтаномнай ахоўнай сігналізацыяй. Акрамя таго, тэрыторыя садаводчых таварыстваў павінна быць агароджана, асветлена і ахоўвацца вартаўніком.

**Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА,** *«Мінск—Навіны».*

### Крадуць у школе і бальніцы

Дырэктар сярэдняй школы ў аграрным гарадку Ноўка, што недалёка ад Віцебска, паведаміў у міліцыю пра тое, што пад вечар з класа працоўнага навучання скралі сістэмны блок камп'ютара. У Віцебскім раённым аддзеле ўнутраных спраў высветлілі, што на крадзеж пайшоў мясцовы жыхар, 30-гадовы рабочы. Заведзена крымінальная справа.

А ў Віцебскай абласной клінічнай бальніцы ўвечары з незачыненага пакоя медыцынскага персаналу нехта скраў два кашалькі, якія належаць медсёстрам. Унутры кашалькоў былі грошы і банкаўскія карткі. Супрацоўнікі дэпартамента «Ахова» высветлілі, што іх скраў 25-гадовы беспрацоўны, раней судзімы за крадзяжы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### Здабываў металалом?

У в. Альсевічы з гаража дачнага доміка нехта выкраў зварачны апарат, электрарухавік, электрапрывод... Думалі, што крадзеж зрабілі «залётныя», бо вёска знаходзіцца побач з Баранавічамі. Памыліліся: злодзеем аказаўся 14-гадовы мясцовы жыхар — вучань сярэдняй школы.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### ДРУГІ ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ П'ЯНАГА КУРЫЛЬШЧЫКА

**ПРЭС-СЛУЖБА Магілёўскага УМНС паведамляе аб напружанай абстаноўцы ў вобласці. Толькі 29 студзеня на Магілёўшчыне адбыліся 8 пажараў, у якіх загінулі 5 чалавек.**

У суботу ўдзень пажар у вёсцы Сямёнаўка Клімавіцкага раёна ўнёс жыцці адразу 3-х чалавек. Калі суседка ўбачыла, што з вокнаў хаты прасочваецца дым, то кінулася ратаваць людзей, але дзверы былі зачыненыя знутры. Калі прыехалі выратавальнікі МНС, у хаце, якая гарэла, знайшлі целы 82-гадовага гаспадара, яго 76-гадовай жонкі і іх 44-гадовага сына. Неасцярожнасць пры курэнні — першая версія ўзнікнення пажару.

У вёсцы Падлеснай Хоцімскага раёна хата пенсіянеркі стаяла наводшыбе, таму пажар хутка не заўважылі. Суседзі распавялі, што жанчыне адключылі электрычнасць з-за няплаты, і таму яна карысталася газавай лямпай. Верагодна, газа і стала крыніцай пажару.

У вёсцы Дубовае Асіповіцкага раёна 42-гадовы мужчына прыехаў з горада на дачу і спачатку вырашыў добра пратапіць вільготную і халодную хату. Аднак уначы падраздзяленню МНС ужо давялося ліквідаваць пажар, прычынай якога, верагодна, стала парушэнне правілаў бяспекі пры эксплуатацыі печкі. Мужчыну, ужо без прыкметаў жыцця, выратавальнікі знайшлі літаральна ў некалькіх метрах ад выхаду з хаты.

А вось 58-гадовы жыхар вёскі Хацень Клімавіцкага раёна **29 студзеня можа цяпер святкаваць як свой другі дзень нараджэння**. Суботу ён прысвяціў алкаголю, курэнню і моцнаму сну. Вынік можна было прадказаць: закопчаная кватэра, эвакуіраваныя з-за моцнага задымлення суседзі і ўсё ж выратаваны МНС курыльшчык, якога давялося шпіталізаваць.

**Ілона ІВАНОВА.**

### Бізнэсменаў у глыбінцы ўсё больш

У малых і сярэдніх гарадскіх пасяленнях Віцебскай вобласці дзейнічаюць больш за 22 працэнты ад агульнай колькасці суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці Прыдзвінскага краю. Па звестках абласной падатковай інспекцыі, усяго ў глыбінцы працуюць больш за 10,2 тысячы фірмаў, індывідуальных прадпрымальнікаў... І толькі за мінулы год іх колькасць павялічылася на 377. Летась бізнэсмены з глыбінкі разам заплацілі падаткі на суму больш за 365 мільярдаў рублёў. А гэта ні многа ні мала — каля 9 працэнтаў ад усіх бюджэтных паступленняў.

Што тычыцца аграрных гарадкоў, тут, па звестках на пачатак гэтага года, на падатковым уліку знаходзяцца 5 працэнтаў (больш за 2,3 тысячы суб'ектаў) ад усіх зарэгістраваных у вобласці суб'ектаў гаспадарання. Летась гэтыя дзелавыя людзі разам папоўнілі бюджэт на суму 21,9 мільярда рублёў. Бізнэсмены ўсё ахвотней укладваюць грошы ў беларускую глыбінку, улічваючы магчымасць атрымаць дзяржаўныя льготы і прэферэнцыі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ПРЫПЯЦЬ ВЫЙШЛА НА ПОЙМУ



Фота МНС.

25 падворкаў і каля 20 сельгаспабудоў у чатырох населеных пунктах Жыткавіцкага раёна падтоплены вадой. Паводка прыйшла ў вёскі Верасніца, Запясочча, Перароўскі Млынок і Азярыны. Ёсць пагроза падтаплення падворкаў і дамоў у Петрыкаве і ў вёсцы Мілашэвічы Лельчыцкага раёна. У выніку плюсавых тэмператур рака Прыпяць у раёне вёскі Чэрнічы Жыткавіцкага раёна дасягнула небяспечнай адзнакі 500 см і перавысіла яе на 5 см, пачаўся выхад вады на ўгоддзі і тэрыторыі населеных пунктаў. За апошні тыдзень узровень вады ў Прыпяці павялічваецца на 2 см за суткі. Эвакуацыя людзей і хатніх жывёл пакуль не патрабуецца. Зараз вядзецца пастаянны маніторынг паводкавай сітуацыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 11 февраля 2011 года проводит 2-й повторный открытый аукцион на 3-м аукционе по продаже имущества республиканской собственности**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Наработка в м/ч (износ) | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 4. | Самолет Ан-24Б № 99902203, дв. Аи-24 с. 2 № Н4912105, дв. Аи-24 с. 2 № Н4012035, дв. ТГ-16 № АТ945005, 5 402 посадки, 3 КВР-1994 г. | н.п. Мачулищи в/ч 06752 | 1969 | 5 118 | 650 000 000 | 65 000 000 |
| 5. | Вертолет Ми-26 № 34001212099, дв. Д-136 № 2251364001029, дв. Д-136 № 2251362601143, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 612А8В010 | н.п. Мачулищи в/ч 06752 | 1986 | 590 | 3 680 000 000 | 368 000 000 |
| 6. | Вертолет Ми-26 № 34001212131, дв. Д-136 № 2251364001063, дв. Д-136 № 2251364001064, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 722А8В017 | н.п. Мачулищи в/ч 06752 | 1987 | 594 | 3 870 000 000 | 387 000 000 |
| 7. | Вертолет Ми-26 № 34001212104, дв. Д-136 № 2251364001067, дв. Д-136 № 2251364001068, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 622А8В006 | н.п. Мачулищи в/ч 06752 | 1986 | 593 | 3 680 000 000 | 368 000 000 |
| 8. | Вертолет Ми-26 № 34001212018, КАУ-140 № 82110014030, КАУ-140 № 821100140032, КАУ-140 № 821110140041, КАУ-140-01 № 821033010004, дв. ТА-8В № 042А8В058, 1 КВР-1990 г. | н.п. Мачулищи в/ч 06752 | 1983 | 1 774 | 2 270 000 000 | 227 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00, **11 февраля 2011 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 **9 февраля 2011 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **11 февраля 2011 года.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества **до 11 марта 2011 года.**

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018, код 357, в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**


### ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЛЮТЫ

**1 лютага.** Сённяшняя стрыжка станоўча паўплывае на ваш духоўны свет.

**2 лютага.** Пасля візіту да цырульніка валасы стануць больш густымі і пышнымі. Праўда, зробленая сёння прычоска пратрымаецца нядоўга. А вось уздзейнічаць на валасы хімічнымі рэчывамі сёння крайне непажадана.

**3 лютага.** Любыя маніпуляцыі з валасамі сёння прывядуць да іх патанчэння. Расці яны таксама будуць марудней, а вось форма прычоскі захаваецца даўжэй.

**4 лютага.** Выкарыстайце гэты дзень для эксперыментаў з іміджам, сёння ў цырульніка атрымаецца літаральна ўсё. Але трэба ўлічваць, што сённяшняя стрыжка можа прывесці да таго, што валасы пачнуць крыху завівацца.

**5 лютага.** Сёння да цырульніка лепш не хадзіць, бо ўдача ад вас можа адвярнуцца.

**6 лютага.** Выдатны дзень для любых маніпуляцый з валасамі. Стрыжка забяспечыць не толькі добры настрой, але і прыцягне ў ваша жыццё станоўчыя падзеі і радасць.

**7 лютага.** Сённяшняя стрыжка можа паўплываць на вочны ціск і ўвогуле на вочы не вельмі добра. Візіт да цырульніка лепш адкласці, асабліва калі ёсць якія-небудзь праблемы са зрокам.

**8 лютага.** Любыя змены ў вашым абліччы станоўча паўплываюць на ваша жыццё.

**9 лютага.** Паводле ўсходніх павер'яў, з-за стрыжкі ў гэты дзень да вас могуць «прывязацца» злыя духі. Гэта можа мець дрэнныя наступствы, так што валасы сёння лепш не стрыгчы.

**10 лютага.** У выніку стрыжкі, зробленай сёння, у вас можа з'явіцца «букет» з галаўнога болю, павышанага (ці занадта нізкага) ціску, беспадстаўнай трывогі.

**11 лютага.** Зробленай сёння стрыжкай, завіўкай, афарбоўваннем вы будзеце доўга радавацца, а навакольныя абавязкова заўважаць вашы перамены.

**12 лютага.** Сённяшні візіт да цырульніка будзе ўдалым. Пасля яго зменіцца да лепшага не толькі знешнасць, але і жыццё ў цэлым.

**13 лютага.** Сённяшняя стрыжка прыцягне ў жыццё ўдачу і шчасце.

**14 лютага.** Пасля наведвання цырульні ўзмоцніцца ваша інтуіцыя.

**15 лютага.** Сённяшняя стрыжка можа змяніць ваш лёс да лепшага.

**16 лютага.** Візіт у цырульню станоўча адаб'ецца на вашым матэрыяльным становішчы.

**17 лютага.** Па магчымасці, сёння трэба пазбягаць уздзеяння на валасы, паколькі гэта можа пагоршыць ваша самаадчуванне.

**18 лютага.** Калі сёння наведаць цырульню, гэта прывядзе да павышэння адчувальнасці.

**19 лютага.** Пасля сённяшняй стрыжкі вам будзе спрыяць удача ў кар'еры, асабістых справах і здароўі.

**20 лютага.** З дапамогай стрыжкі ці завіўкі сёння можна істотна змяніць да лепшага сваё матэрыяльнае становішча. Змены іміджу будуць вельмі ўдалымі.

**21 лютага.** Вельмі дрэнны дзень для стрыжкі і ў цэлым для любых маніпуляцый з валасамі. Калі пагрэбаваць гэтай рэкамендацыяй, можна прыцягнуць непрыемнасці ў розных галінах жыцця.

**22 лютага.** Вельмі спрыяльны дзень для стрыжкі. Вы станеце не толькі прыгажэйшымі, але і больш удачлівымі.

**23 лютага.** Сёння лепш не стрыгчыся, бо маніпуляцыі з валасамі могуць прыцягнуць хваробы і лёгкае недамаганне.

**24 лютага.** Вельмі спрыяльны дзень для візіту ў цырульню. Вы будзеце задаволены атрыманым вынікам.

**25 лютага.** Сённяшняя стрыжка можа прывесці да нядобрых наступстваў. Усе вашы шкодныя звычкі і парокі могуць узяць над вамі верх, тым больш што магчымасць кантраляваць свае жаданні і эмоцыі знізіцца.

**26 лютага.** Выдатны дзень для любых маніпуляцый з валасамі. Калі вы хочаце дасягнуць схільнасці кіраўніцтва, павялічыць уласнасць, стаць багацей, то абавязкова наведайце цырульню.

**27 лютага.** Калі хочаце пакінуць у навакольных моцнае ўражанне ці скарыць сэрца каханага чалавека, абавязкова змяніце сёння прычоску. Вынік не прымусіць сябе чакаць.

**28 лютага.** Стрыжка, зробленая сёння, прыцягне ў ваша жыццё ўдачу і дабрабыт.

**Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**


**Открытое акционерное общество «МинскСортСемОвощ»**

**сообщает, что 28 января 2011 года состоялось внеочередное общее собрание акционеров, на котором было принято решение о внесении изменений в устав Общества.**

В течение 30 дней с даты проведения собрания принимаются письменные требования о выкупе акций акционеров, которые не участвовали в этом собрании, по адресу: 220014, г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1. Цена выкупа акций — 1500 (Одна тысяча пятьсот) рублей за 1 простую (обыкновенную) акцию.

**Телефоны для справок: 226 25 87, 222 96 75.**

УНП 600052664



**Не сакрэт: пачатак новага працоўнага года нямала для якіх суб'ектаў гаспадарання, а ў першую чаргу, вядома, для іх кіраўнікоў, даволі часта звязаны з турботамі пра тое, каб загрузіць людзей працай, каб ужо адразу ўключыцца ў дакладны працоўны рытм. Далёка не заўсёды гэта атрымліваецца. І не ва ўсіх. А вось у кіраўнічых кадраў Слуцкай перасовачнай механізаванай калоны № 225 (ПМК-225) турботы яўна іншага роду.**

**— Дзень пайшоў даўжэць — можна арганізоўваць другую змену, — казаў падчас сустрэчы прараб ПМК-225 Фёдар Мароз. — Да таго ж будаўнічая пляцоўка добра асветленая, цэглы хапае... У нашай справе хуткасць немалое значэнне мае: чым хутчэй пабудуем — тым меншымі будуць выдаткі, у цэлым будаўніцтва таннейшым атрымаецца. Карацей кажучы, прахалоджвацца няма калі. А яшчэ нам тут, на пляцоўцы, і разгарнуцца няма дзе, а гэта таксама трохі стрымлівае...**



# Слуцкая ПМК-225
# СЁННЯ ДВОЕЧНІК І НА БУДОЎЛІ НЕ ПАТРЭБНЫ











Змена, якой кіраваў Фёдар Мароз, узводзіла ў Слуцку 40-кватэрны дом жыллёва-будаўнічага кааператыва. Месца, выбранае для будаўніцтва, было застаўлена навокал іншымі дамамі, пабудаванымі раней, і вежавы кран з цяжкасцю маніпуляваў на абмежаванай будаўнічай пляцоўцы.

— Трэба да ліпеня дом здаць, — працягваў Фёдар Мароз. — Адпаведна, на поўную сілу сталі працаваць ужо адразу ж пасля навагодняга свята. Увогуле, нам інакш і нельга — кран арандуем, а яго арэнда нямала каштуе; трэба выкарыстоўваць яго спаўна.

Фёдар Мароз — родам з Украіны, з Харкава. Будаўнічай справай займаўся і там — у асноўным, рэканструкцыяй гістарычных помнікаў (варта звярнуць на гэта ўвагу кіраўніцтва як ПМК-225, так і прадпрыемства «Мінскаблсельбуд», якому ПМК-225 падведамнае — а раптам спатрэбіцца). Але аднойчы зачаравала яго беларуская дзяўчына са Слуцка — так і асеў тут ужо колькі гадоў таму: сям'я, дзеці... І не шкадуе, хоць пры гэтым і зазначае: «А ў Харкаве зіма ўсё-такі цяплейшая». Карацей кажучы, беларускім будаўнікам зімой цяжэй прыходзіцца.

— Ну вось, перакрываем першы паверх, і ўжо адразу, услед за намі, пойдуць, пачынаючы з падвала, сантэхнікі — пракладваць каналізацыю, а таксама электрыкі са сваімі разводкамі. Такое цеснае суседства на пляцоўцы з субпадрадчыкамі (а выконваць гэтыя работы будуць менавіта яны) і тэрмін здачы дома значна набліжае, — казаў ужо галоўны інжынер ПМК-225 Сяргей Казлоўскі.

* * *

Аднак калі наваселлі случчан у гэтым доме пакуль што ў перспектыве, то ў іншым доме, які таксама ўзводзіла ПМК-225, наваселлі адбыліся, можна лічыць, якраз пад новы год. У прыватнасці, гэта 80-кватэрны дом па вуліцы Барысаўца, што таксама ў Слуцку. Галоўны інжынер мехкалоны паказваў гэты дом з асаблівым гонарам. А справа ў тым, што гэты дом стаў першым у кірунку буйнапанэльнага домабудавання, які пачалі асвойваць у ПМК-225 летась (дарэчы, гэта першы вопыт у жыллёвым будаўніцтве ў Мінскаблсельбудзе ўвогуле).

Цяпер у ПМК-225 прызнаюцца, што адважыцца на гэты вопыт прымусіла сітуацыя. Быў таксама пачатак новага працоўнага года (леташняга), а аб'ёмаў пад поўную загрузку, у адрозненне ад цяперашняга года, не хапала. Пры гэтым побач жа, у Слуцку, разам з будаўнічымі арганізацыямі горада, узводзілі жыллё для случчан і працаўнікі Салігорскага домабудаўнічага камбіната, якія якраз і будавалі дамы з панэляў, і ў яго на той час не хапала магутнасцяў, каб узяцца адразу за ўсе аб'екты. Гэтай сітуацыяй і скарыстаўся малады кіраўнік ПМК-225 Андрэй Яновіч. Папрасіў гэты дом для свайго калектыву, хоць у мехкалоне дагэтуль і не займаліся буйнапанэльным домабудаваннем, не мелі адпаведнага вопыту. Праўда, быў у калектыва даволі багаты вопыт па мантажы жалезабетонных канструкцый для жывёлагадоўчых памяшканняў. Але ж гэта ўсё-такі дом, а не МТФ. Словам, сфарміравалі ў ПМК-225 брыгады мантажнікаў, адправілі іх павучыцца да тых жа салігорскіх домабудаўнікоў і ўжо потым прыступілі да справы.

Быў у гэтым будаўніцтве яшчэ адзін нюанс. Дом, які ўзводзілі, прызначаўся для работнікаў культуры і адукацыі, для медработнікаў; адпаведны жыллёва-будаўнічы кааператыў так і называўся — «Культработнік». А перад такой катэгорыяй навасёлаў асабліва хочацца паказаць сябе ў найлепшым святле. Можна меркаваць, атрымалася. 12 кастрычніка кіраўнік ПМК-225 Андрэй Яновіч перадаў сімвалічны ключ ад дома старшыні ЖБК «Культработнік», а ўжо старшыня райвыканкама — сапраўдныя ключы ад кватэр навасёлам. За гэты час, зазначае галоўны інжынер, сур'ёзных скаргаў на якасць будаўніцтва не паступала.

Цяжкі толькі пачатак... Летась жа будаўнікі ПМК-225 пачалі мантаж з панэляў 2-секцыйнага 110-кватэрнага дома ў Нясвіжы (адна секцыя на 50 кватэр ужо змантыравана, цяпер ідзе мантаж другой); чакаюць яны праектна-каштарысную дакументацыю і на чарговы дом БПД у Слуцку.

— Так, спачатку было нялёгка. Буйнапанэльнае домабудаванне — гэта ўсё-такі абсалютна новая для нас справа. Тым не менш, асвоілі, а разам з тым набылі новую для нас прафесію. А мець дадатковую прафесію, вядома ж, нікому і ніколі не шкодзіць, — падкрэслівае кіраўнік ПМК-225.

Варта тут удакладніць: у пераліку работ, якія, у асноўным, выконваюць у ПМК-225, наступныя: мантаж жалезабетонных канструкцый збудаванняў, кладка сцен з цэглы, цяслярныя, дахавыя і некаторыя іншыя работы. А разам з тым у адпаведных дакументах калектыў зафіксаваў права на вядзенне аддзелачных работ, работ па абуладкаванні сетак і сістэм водазабеспячэння і каналізацыі, хоць гэтымі відамі дзейнасці тут цяпер і не займаюцца, а даручаюць субпадрадчыкам. Безумоўна, зафіксавалі «на запас», на перспектыву, маючы на ўвазе той жа агучаны вышэй тэзіс: дадатковая прафесія нікому і ніколі не шкодзіць.

* * *

Аднак, напэўна, найбольш маштабны аб'ект, над узвядзеннем якога таксама працуе цяпер калектыў ПМК-225, знаходзіцца ў сельскагаспадарчым вытворчым кааператыве «Раманава», размешчаным непадалёк ад Слуцка. Тут узводзіцца буйны жывёлагадоўчы комплекс, разлічаны на ўтрыманне 600 галоў малочнага статка. Кошт усяго комплексу, з усімі яго пабудовамі, — каля 20 мільярдаў рублёў. Зразумела, гэта будзе цалкам сучасны комплекс, з поўнасцю механізаванымі і аўтаматызаванымі працэсамі ўтрымання, кармлення і даення жывёлы... На комплексе, падчас яго наведвання, ішоў мантаж жалезабетонных канструкцый першай чаргі (а будаўніцтва тут разлічана на дзве чаргі), вялося абуладкаванне даху і падлогі памяшканняў. Паводле слоў майстра Аляксандра Дамарада, усё тут ішло без асаблівых праблем («тэхніка — свая, будаўнічымі канструкцыямі і матэрыяламі забяспечаны»), ды вось толькі праекціроўшчыкі часам «перашкаджаюць» — умешваюцца з тымі або іншымі змяненнямі ў дакументацыю, прычым іншым разам даводзіцца перарабляць і тое, што ўжо зроблена. «Яно зразумела: працэс удасканалення можа быць бясконцым. Але ж трэба пры гэтым думаць і пра сваіх дзелавых партнёраў, або пра нас, будаўнікоў...».





Словам, трэба паважаць іх працу. Тым больш, павагі будаўнікі ПМК-225 заслугоўваюць: на іх рахунку ўжо далёка не адна ўзведзеная імі сучасная малочнатаварная ферма, прычым як непасрэдна ў Слуцкім раёне, так і ў Ваўкавыскім, Баранавіцкім, Стаўбцоўскім, Любанскім, Капыльскім і іншых раёнах рэспублікі. Напрыклад, можна назваць тут гаспадарку «Кляновічы» з Крупскага раёна, якую апякае галоўны банк краіны — зразумела, тут таксама шчыравалі будаўнікі ПМК-225; можна нагадаць пра гаспадаркі Ваўкавыскага раёна...

— Гэта ж, як быццам, няблізка — Ваўкавыскі раён, — кажу галоўнаму інжынеру.

— Так, няблізка, але ўсё роўна выгадна для нас. Тым больш, не адмаўляцца ж ад працы... Генеральны падрадчык, які задзейнічаны ў гэтым раёне на жывёлагадоўчых комплексах, добра ведае пра нас, ведае пра нашы аб'екты, мантаж якіх мехкалона выконвала. Якасць нашай работы цалкам задавальняе яго, вось і запрашае нас менавіта для мантажу...

Што ж, як кажуць у такіх выпадках, наяве добрая запатрабаванасць у паслугах ПМК-225, і яна — зусім не выпадковая.

* * *

Аднак, напэўна, варта было пачаць гэты матэрыял з лічбаў, або з паказчыкаў, з якімі ПМК-225 закончыла мінулы год. А яны — адны з найлепшых у аблсельбудзе. Такім чынам, рост аб'ёму будаўніча-мантажных работ склаў тут за мінулы год 145 працэнтаў. Пры гэтым прасочым адпаведную дынаміку: у 2008 годзе аб'ём БМР склаў 7580 мільёнаў рублёў, у 2009-м — 9682 мільёны, у 2010 годзе — 15 933 мільёны. З кожным годам расце тут і прадукцыйнасць працы: у 2008 годзе выпрацоўка на аднаго чалавека склала 43,5 мільёна рублёў, у 2009-м — 51,5 мільёна, у мінулым годзе — 69,8.

Але, напэўна, найбольш паказальная наступная лічба: летась удзельная вага фонду заработнай платы ў агульным аб'ёме будаўніча-мантажных работ істотна знізілася і склала 17,5 працэнта. Што гэта азначае? Сталі плаціць менш? Наадварот, рост сярэднямесячнай заработнай платы склаў 137 працэнтаў. А ўказаная супярэчлівасць тлумачыцца вельмі проста: у ПМК-225 сталі, так бы мовіць, значна больш паважаць працоўны час. Гэтая дынаміка, безумоўна, сведчыць пра больш эфектыўнае выкарыстанне працоўнага часу, лепшую арганізацыю працы, пра яўнае скарачэнне, а то і пазбаўленне ад грашовых выдаткаў за вымушаныя прастоі і г.д. Усё гэта з'яўляецца таксама і вынікам добрага тэхнічнага аснашчэння мехкалоны. Вось толькі некаторыя з набыткаў мехкалоны за апошнія два гады: 20-тонны і 10-тонны МАЗы, коханаўскі экскаватар, бульдозер, два аўтакраны, аўтавышка і іншая тэхніка. Дарэчы, усё — па лізінгу. І ў сувязі з гэтым мы сказалі кіраўніку:

— А за ўсё гэта трэба плаціць, і з немалымі працэнтамі.

— Безумоўна, — адказаў ён. — Але ж гэтыя працэнты проста несуразмерныя з тымі стратамі, якія магла б мець мехкалона пры адсутнасці добрай тэхнікі. Напрыклад, сапсаваўся аўтакран — значыць людзі на аб'екце прастаялі, парушыліся тэмпы, рытмічнасць, будаўніцтва зацягнулася на большы тэрмін. А ўсё гэта патрабуе немалых дадатковых выдаткаў... Мець добрыя, важкія аб'ёмы работ (а мы іх сёння маем, прычым і сёлетні рост абяцае быць вельмі значным) і пры гэтым шкадаваць грошай на тэхніку, толькі з дапамогай якой гэтыя аб'ёмы і можна выканаць, — гэта крайне нелагічна...

* * *

Можа, яшчэ раней варта было сказаць: да кіраўніцтва ПМК-225 прыйшла зусім маладая каманда. Гэта датычыць як непасрэдна самога дырэктара мехкалоны, так і галоўнага інжынера, і начальніка вытворчасці Аляксандра Стаіча. Яна ўжо адразу выявіла, і ў першую чаргу непасрэдна сам кіраўнік, такія якасці, як настойлівасць і ўчэпістасць, смеласць пры прыняцці тых або іншых рашэнняў. Напрыклад, на тое ж панэльнае домабудаванне можна было пайсці, маючы менавіта смеласць. Іншы кіраўнік, можа, і падумаў бы: няма аб'ёмаў — і вялікай бяды няма. Узяцца за зусім новую справу? Дык трэба ж асвойваць яе, вучыць людзей — словам, трэба рызыкаваць. А ці варта?

Праўда, нельга не сказаць тут і пра іншае: энтузіязм і напорыстасць маладой каманды цвёрда абапіраліся і абапіраюцца на вопыт старых кадраў — ужо названага вышэй прараба Фёдара Мароза, майстра Аляксандра Дамарада, майстра Васіля Галузы, механіка Анатоля Казлоўскага і іншых.



Каля двух з паловай гадоў таму ўзначаліў ПМК-225 Андрэй Яновіч, з яго прыходам працаўнікі мехкалоны ў многім і звязваюць тыя добрыя перамены, якія тут адбыліся, яе цяперашнія дасягненні. ПМК-225 цяпер на добрым уздыме, і можна спадзявацца: гэты добры рух наперад не будзе спынены. Гэта, аднак, не азначае, што ў мехкалоне жывуць і працуюць без праблем. Безумоўна, адной з найбольш актуальных праблем з'яўляецца праблема замацавання ў мехкалоне працоўных кадраў. У сувязі з гэтым малады дырэктар яўна занепакоены:

— Часам яшчэ па-ранейшаму лічаць, што прафесія будаўніка не зусім прэстыжная. Маўляў, будзеш дрэнна вучыцца — пойдзеш у будаўнікі... Ды не, гэта ўжо ўстарэлы погляд. Так, прафесія будаўніка нялёгкая. Але сёння ж на будоўлю прыйшла зусім іншая арганізацыя працы, зусім іншыя ўмовы. Так, на ўсіх будаўнічых аб'ектах ёсць дзе і пераапрануцца, схавацца ад непагадзі, падмацавацца. Дастаўка на аддаленыя аб'екты і назад — спецыялізаваным транспартам. У прыватнасці, мы для гэтай мэты маем тры «Газелі», два аўтобусы, дзве «лятучкі», будзем яшчэ набываць аўтобус. Цяпер будаўнікі маюць неблагую заработную плату — хоць, можа, і не самую высокую, але, скажам так, даволі годную. Сёння яны маюць магчымасць хутчэй за іншых пабудаваць для сябе ўласнае жыллё. Увогуле, сёння яўны «двоечнік» і на будоўлі не патрэбны...

Застаецца гэтую кадравую тэму завяршыць наступным фактам: яшчэ каля трох гадоў таму ў ПМК-225 працавала недзе каля 150 чалавек, а сёння — ужо каля 250. Дарэчы, гэтую адметнасць называюць цяпер стварэннем новых працоўных месцаў, якія вельмі патрэбныя цяпер у мехкалоне. Як падкрэсліваў яе кіраўнік, працы ў ёй, заказаў на сёлета — «пад завязку».

* * *

Нельга нічога не сказаць у гэтым матэрыяле і пра так званыя сацыяльныя даброты калектыву. А іх тут, па сутнасці, таксама «пад завязку». Адміністрацыя і прафсаюзны камітэт знаходзяцца ў добрых партнёрскіх адносінах, добра разумеюць адно аднаго. Пры гэтым вось які добры пункт запісалі яны ў калектыўным дагаворы: «Бакі прызнаюць, што без стварэння неабходных умоў для задавальнення духоўных патрэбнасцяў работнікаў ПМК-225, далучэння іх да культуры, мастацтва, спорту немагчымая высокая культура вытворчасці, сацыяльны дабрабыт усяго калектыву». І не проста запісалі: адміністрацыя за кошт прадпрыемства напалову пакрывае ўсе выдаткі, звязаныя з культурна-масавымі мерапрыемствамі прафсаюзнага камітэта, а да таго ж штомесяц пералічвае на рахунак прафкама сродкі ў памеры 0,15 працэнта ад фонду заработнай платы. Так званы сацыяльны пакет, замацаваны ў калектыўным дагаворы, у які ўваходзяць рознага роду дапамогі (на вяселле, народзіны, дадатковы аплатны водпуск, садавіну—агародніну і г.д.), па сутнасці, — да самых краёў. Не забыліся ў тым жа калдагаворы пры фарміраванні сацыяльнага пакета і пра ветэранаў, якія працавалі некалі ў мехкалоне... Шчыра кажучы, можна было б узяць гэтыя самыя калектыўны дагавор і сацыяльны пакет, якія сведчаць пра сапраўднае сацыяльнае партнёрства ў мехкалоне, нашым іншым асобным прадпрыемствам і арганізацыям для ўзору — не пашкодзіла б.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**

## УХІЛ — НА БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ
### Такі прыярытэт вызначаны ва ўнітарным прадпрыемстве «Мінскаблсельбуд»

За мінулы год будаўнічыя арганізацыі «Мінскаблсельбуда» ўвялі 78 тысяч квадратных метраў жылля. У эксплуатацыю здадзены 23 шматкватэрныя дамы, якія ўзведзены праз ЖБК і долевы ўдзел грамадзян, а таксама прызначаны для сацыяльнага жылля; 231 дом катэджнага тыпу атрымалі ад працаўнікоў «Мінскаблсельбуда» жыхары вёскі. За год арганізацыі «Мінскаблсельбуда» выканалі будаўніча-мантажных работ па генеральных падрадах на суму амаль 300 мільярдаў рублёў, у тым ліку работ уласнымі сіламі на суму звыш 260 мільярдаў. Арганізацыі «Мінскаблсельбуда» выканалі даведзенае заданне па энергазберажэнні; рэнтабельнасць асноўнай вытворчасці ў цэлым па прадпрыемстве склала 7 працэнтаў пры прагнозным паказчыку 5 працэнтаў; у будаўнічых арганізацыях прадпрыемства створана 150 новых рабочых месцаў.

На нядаўнім савеце дырэктараў падведамных «Мінскаблсельбуду» арганізацый зацверджаны паказчыкі прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця прадпрыемства на сёлета; кіраўнікам даччыных прадпрыемстваў прапанавана распрацаваць і прадставіць на зацвярджэнне адпаведныя бізнэс-планы.







**НА ЗДЫМКАХ:**

**1. Узводзіцца 40-кватэрны дом.**

**2. 80-кватэрны дом па вуліцы Барысаўца ў Слуцку, які здалі будаўнікі ПМК-225 восенню летась.**

**3. Майстар Фёдар МАРОЗ.**

**4. Старшыня прафкама, вядучы спецыяліст аддзела кадраў Таццяна ВАСІЛЕВІЧ задаволеная: у новым калектыўным дагаворы, прынятым нядаўна, сацыяльных даброт — да краёў.**

**5. Механік Міхаіл КРАЎЧУК.**

**6. Інжынер вытворча-тэхнічнага аддзела Алёна КІСЛЯК.**

**7. Майстар Аляксандр ДАМАРАД.**

**8. 15. Дырэктар Андрэй ЯНОВІЧ.**

**9. Будуецца малочнатаварная ферма ў СВК «Раманава».**

**10. Майстар Васіль ГАЛУЗА і галоўны інжынер Сяргей КАЗЛОЎСКІ.**

**11. Электрагазазваршчык Уладзімір ХАДАРОВІЧ.**

**12. Кранаўшчык Генадзь МАЛОЧКА.**

**13. Брыгада будаўнікоў: муляр Уладзімір МАЛЬЦАЎ, зваршчык Андрэй ПІСКУР, муляры Павел ГРЫЦКЕВІЧ, Уладзімір ЛАБАЦКІ і Аляксандр УСОВІЧ.**

**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

УНП 690019417.

# МІНСК ПРАПАНУЕ ДАДАТКОВУЮ ПАДТРЫМКУ

Сяргей ГРЫБ

**ПЕНСІІ, дапамогі на дзяцей, адрасная сацыяльная дапамога — варыянтаў падтрымкі існуе шмат, прычым у выпадку неабходнасці звярнуцца па яе мае права кожны жыхар Беларусі. Але часам магчымасці вырашэння тых або іншых праблем гэтым не абмяжоўваюцца: свае «дадатковыя» сацыяльныя праграмы могуць прымаць асобныя рэгіёны. У прыватнасці, з пачатку студзеня ў Мінску пачала працаваць гарадская праграма развіцця сацыяльнага абслугоўвання на 2011—2015 гады. І менавіта яна стала нагодай для сустрэчы карэспандэнта «Звязды» з намеснікам начальніка ўпраўлення сацыяльнай падтрымкі насельніцтва — начальнікам аддзела па рабоце з ветэранамі, інвалідамі і пажылымі людзьмі камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірынай Мікалаеўнай Дудкай.**

## РАМОНТ — НЕ БЕЗВЫХОДНАСЦЬ?

Не сакрэт, што адсутнасць магчымасці працаваць і атрымліваць зарплату часам становіцца прычынай узнікнення шматлікіх праблем, і ў прыватнасці, — праблем з рамонтам і абуладкаваннем жылля. У сувязі з гэтым вырашана: інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны (жыхары Мінска); беспрацоўныя бацькі, жонка ці муж (пры ўмове, калі апошнія не ўзялі новы шлюб) вайскоўцаў, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай або пры выкананні вайсковых абавязкаў; беспрацоўныя адзінокія інваліды I і II груп; беспрацоўныя адзінокія пажылыя грамадзяне могуць атрымаць выплату на фактычную кампенсацыю выдаткаў у памеры да 5 бюджэтаў пражытковага мінімуму на дату падачы заявы на рамонт кватэр ці дамоў, замену і рамонт сантэхнікі, газавага і электрычнага абсталявання, вокнаў і дзвярэй, а таксама на іншыя рамонтныя работы ці на набыццё неабходных для іх матэрыялаў.

— У выпадку патрэбы кампенсацыя «рамонтных» выдаткаў можа прадстаўляцца як уласнікам, так і наймальнікам жылых памяшканняў ці членам арганізацый забудоўшчыкаў, — распавядае Ірына Дудка. — Але тут варта мець на ўвазе: выплаты не робяцца асобам, якія атрымалі падобную дапамогу на працягу двух папярэдніх гадоў.

## КАМУ ПЕНСІЙНАЯ ПРЫБАЎКА?

Адзін з традыцыйных напрамкаў гарадской праграмы — матэрыяльная дапамога. Так, на працягу наступных пяці гадоў дадатковая штомесячная выплата за кошт сталічнага бюджэту ў памеры 50 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце прадугледжана для членаў сем'яў вайскоўцаў, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі ці памерлі падчас Вялікай Айчыннай вайны — пры ўмове, што сёння члены сем'яў загінулых з'яўляюцца ветэранамі, інвалідамі ці пажылымі людзьмі. Адначасова непасрэдна інваліды і ветэраны вайны ў Мінску павінны атрымліваць штомесяц па адной мінімальнай пенсіі па ўзросце.

Права на «сталічную» прыбаўку да пенсіі ў такім жа памеры вызначана для маці (а пры яе адсутнасці — для бацькі) вайскоўцаў, якія загінулі пры выкананні вайсковай службы, у Афганістане або ў іншых краінах, дзе вяліся баявыя дзеянні — пры ўмове, што маці ці бацька не працуе, не зарэгістраваны ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка і пры гэтым мае статус ветэрана, інваліда ці пажылога чалавека. Зноў жа сем'і вайскоўцаў, якія загінулі пры выкананні сваіх абавязкаў, атрымліваюць права на аднаразовую выплату ў памеры 150 тысяч рублёў на набыццё кветак і вянкоў для наведвання месцаў пахаванняў. На аналагічную выплату могуць различваць і ветэраны, інваліды ці пажылыя людзі з ліку членаў сем'яў усіх тых, хто загінуў падчас трагедыі на станцыі метро «Няміга».

Плюс да таго бацькі, жонка ці муж (калі яны не ўзялі новы шлюб) грамадзян, якія загінулі ці памерлі ў Афганістане і іншых краінах баявых дзеянняў, а таксама ветэраны, інваліды ці пажылыя людзі з сем'яў тых, хто загінуў падчас трагедыі на «Нямізе», могуць различваць на мэтавыя выплаты ў памеры да 5 бюджэтаў пражытковага мінімуму на рамонт надмагілкавых збудаванняў.

— Паводле гарадской праграмы, права на штомесячныя дадатковыя выплаты ў памеры 50 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце маюць інваліды I і II груп, якія не працуюць, не зарэгістраваныя ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка і пры гэтым атрымліваюць сацыяльныя пенсіі па інваліднасці, — распавядае Ірына Дудка. — А мінчане, якія атрымліваюць «грамадзянскую» пенсію і дасягнулі 95-гадовага ўзросту, могуць различваць на штомесячную «прыбаўку» ў памеры 100 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце, калі пералічаныя вышэй катэгорыі жыхароў сталіцы не знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні.

## АД ПРАЛЬНІ ДА ТАЛОНАЎ НА АБЕД

З бюджэту сталіцы будзе цалкам аплачвацца 16-дзённы курс медыка-псіхалагічнай рэабілітацыі ў рэабілітацыйным цэнтры Героям Беларусі і Савецкага Саюза, Героям Сацыялістычнай Працы, поўным кавалерам ордэнаў Айчыны, Славы, Працоўнай Славы. Такое ж права (за выключэннем выпадкаў праходжання курса медыка-псіхалагічнай рэабілітацыі паводле праграмы гарадскога дабрачыннага фонду «Эліяс» на працягу двух папярэдніх гадоў) вызначана для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, членаў сем'яў вайскоўцаў, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі ці памерлі падчас Вялікай Айчыннай, бацькоў вайскоўцаў, якія загінулі пры выкананні сваіх абавязкаў, і ў тым ліку — у Афганістане.

Апроч таго, вызначана яшчэ некалькі напрамкаў. Так, ветэраны, інваліды і пажылыя людзі, якія знаходзяцца на надомным абслугоўванні і цалкам страцілі магчымасць рухацца, могуць различваць на бясплатнае мыццё 10 кілаграмаў бялізны ў пральнях сталіцы адзін раз у месяц. А адзінокія непрацаздольныя мінчане, якія зноў жа цалкам страцілі магчымасць рухацца і пры гэтым атрымліваюць пенсію ў памеры не больш за 2 бюджэты пражытковага мінімуму, маюць права на атрыманне кампенсацыі выдаткаў на паслугі сядзелкі з тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва — памер такой кампенсацыі складае 1 БПМ

Сталічныя інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, беспрацоўныя бацькі, жонка ці муж (пры ўмове, калі апошнія не ўзялі новы шлюб) вайскоўцаў, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай або пры выкананні вайсковых ці службовых абавязкаў, беспрацоўныя адзінокія пажылыя грамадзяне і беспрацоўныя адзінокія інваліды I-II груп могуць различваць на бясплатную ўстаноўку ў кватэры або прыватным доме аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў. Таксама адметны момант — і магчымасць атрымання да 15 талонаў у месяц на бясплатнае харчаванне адзінокім і адзінока пражываючым інвалідам I-II груп, пенсіянерам і шлюбным парам пенсіянераў, памер пенсій якіх не перавышае 120 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ТАКСІ І ПАМПЕРС ДЛЯ ДАРОСЛЫХ

Адно з новаўвядзенняў сталіцы — кампенсацыя выдаткаў на набыццё «дарослых» памперсаў у памеры да 3 базавых велічынь 2 разы ў год інвалідам I групы, якія маюць адпаведныя захворванні і атрымліваюць пенсію, што не перавышае 2 бюджэты пражытковага мінімуму. Апроч таго, Мінск першым у краіне пайшоў на аказанне інвалідам I групы і інвалідам-калясачнікам паслуг так званага «сацыяльнага таксі».

Тыя ж інваліды-калясачнікі, якія маюць I групу, захавалі здольнасць да частковага самаабслугоўвання, валодаюць медыцынскімі паказаннямі пры аднача́совай адсутнасці проціпаказанняў, і, нарэшце, якія не выкарысталі сваё права на бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне ў папярэднім годзе, могуць различваць на аплату за кошт гарадскога бюджэту курса аднаўленчага лячэння ў рэабілітацыйным цэнтры. І зноў жа калясачнікам бюджэт можа аплачваць пропускі ці абанементы на паслугі для гэтай катэгорыі грамадзян у рэабілітацыйным цэнтры.

## ТРОЙНЯ СА ШТОМЕСЯЧНАЙ ДАПЛАТАЙ

Асобная гаворка пра дзяцей. Так, гарадская праграма прадугледжвае частковую даплату на набыццё пуцёвак у загарадныя летнікі для дзяцей, бацькі якіх працуюць у бюджэтных арганізацыях; даплату да поўнага кошту пуцёвак ў абаронна-спартыўныя летнікі для дзяцей, якія выхоўваюцца ў неспрыяльных сем'ях і маюць канфлікт з законам; даплату (адзін раз у год) да поўнага кошту пуцёвак на аздараўленне і на наведванне профільных і палатачных круглясутачных летнікаў для дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у навучанні, спорце і грамадскай дзейнасці; даплату да поўнага кошту пуцёвак на аздараўленне дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі. Даплата (у памеры 90 працэнтаў кошту пуцёўкі) вызначана і для моладзі, ветэранаў ці пажылых людзей, якія суправаджаюць у кругласутачныя аздараўленчыя арганізацыі дзяцей-інвалідаў з парушэннямі апорна-рухальнага апарату.

Паводле гарадской праграмы, бюджэт сталіцы бярэ на сябе выдаткі па аплаце харчавання ва ўстановах адукацыі выхаванцам дзіцячых дамоў сямейнага тыпу і прыёмных сем'яў, на аплату гадавога праязнога на ўсе віды грамадскага транспарту школьнікам з сем'яў, дзе выхоўваецца пяць і больш дзяцей.

— Варта сказаць і аб некаторых дадатковых «сталічных» дапамогах, — адзначае Ірына Дудка. — У прыватнасці, гаворка аб штомесячнай «гарадской» даплаце да сацыяльнай пенсіі на дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў у памеры 150 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце (за выключэннем выпадкаў знаходжання на поўным дзяржаўным забеспячэнні); штомесячнай выплаце па 1 базавай велічыні на кожнае дзіця сем'ям, дзе нарадзілася тройня; аднаразовай выплаце ў памеры бюджэту пражытковага мінімуму былым выхаванцам дамоў-інтэрнатаў ва ўзросце да 23 гадоў, якія з'яўляюцца сіротамі ці засталіся без бацькоўскай апекі і якія атрымліваюць прафесію; аднаразовай выплаце да навучальнага года ў памеры 30 працэнтаў БПМ на кожнае дзіця шматдзетным сем'ям, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў — калі дзеці не знаходзяцца на дзяржзабеспячэнні, не працуюць і пры гэтым вучацца, прычым вучацца не ў вячэрніх школах.

## УМОВА — ПАСТАЯННАЯ «ПРАПІСКА»

Зразумела, што ўмовы атрымання дадатковай «гарадской» падтрымкі вельмі розныя. Таму, раіць Ірына Дудка, патэнцыяльным прэтэндэнтам ёсць сэнс звяртацца па кансультацыі і тлумачэнні ў раённыя ўпраўленні па сацыяльнай абароне сталіцы.

— Аднак тут нялішне заўважыць: праграму дадатковай падтрымкі фінансуе бюджэт Мінска, — кажа Ірына Дудка. — Адпаведна, различваць на пералічаныя віды дапамогі могуць толькі асобы, якія маюць пастаянную рэгістрацыю ў сталіцы.

# Жывая рыба павінна «стаць бліжэй» да спажыўца

**НА пачатак года з 6,5 тысячы крамаў у краіне, якія маюць дазвол на гандаль рыбай і прадукцыяй яе перапрацоўкі, продаж сажалкавай рыбы з акварыумаў вялі толькі 1003 крамы (15,4 працэнта). Паводле слоў начальніка аддзела ўпраўлення арганізацыі спажывецкага рынку харчовых тавараў Міністэрства гандлю Таццяны Краснюк, прынята рашэнне калегіі міністэрства аб павелічэнні колькасці акварыумаў у арганізацыях гандлю.**

Калі зараз іх налічваецца ў цэлым па краіне больш за тысячу штук, дык да канца гэтага года гэтую колькасць плануецца давесці да 2116.

Па словах начальніка аддзела спажывецкага рынку харчовых і нехарчовых тавараў упраўлення гандлю і паслуг Мінскага аблвыканкама Людмілы Кохан, за мінулы год было ўстаноўлена 15 акварыумаў і 22 ёмістасці. Акрамя таго, у гарадах і раённых цэнтрах, буйных населеных пунктах мясцовымі органамі ўлады па ўзгадненні з рыбаводчымі гаспадаркамі вызначаныя месцы, на якіх вёўся продаж сажалкавай рыбы са спецыялізаванага аўтатранспарту рыбаводчых арганізацый (96 пляцовак).

У Мінску гандлююць рыбай каля 800 крамаў і 15 рынкаў. Сажалкавую рыбу прадаюць 160 прадпрыемстваў рознічнага гандлю і тры рынкі. У крамах устаноўлена 199 акварыумаў. Да канца гэтага года даведзена заданне па ўстаноўцы ў арганізацыях гандлю каля 400 акварыумаў, як распавяла начальнік аддзела бакалейных тавараў галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Людміла Гаўраш.

Дарэчы, усяго ў мінулым годзе гандаль са спецыялізаванага аўтатранспарту рыбгасаў вёўся больш чым на 600 гандлёвых кропках выязнога гандлю. Улічваючы тое, што сярэдняя загрузка аўтамашын для рэалізацыі рыбы складае 350-400 кілаграмаў рыбы ў дзень, а сярэдняя адлегласць дастаўкі рыбы па краіне складае 130-150 кіламетраў, эфектыўным з пункту гледжання акупнасці выдаткаў на продаж з'яўляюцца кропкі, на якіх рэалізуецца не менш за 250-300 кілаграмаў рыбы ў дзень. Адной з дзейсных формаў гандлю намеснік дырэктара дэпартамента па меліярацыі і воднай гаспадарцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Вікенцій Завадскі лічыць рыбныя кірмашы. Калі і насельніцтва можа за меншы кошт набыць рыбную прадукцыю, прычым у шырокім асартыменце (напрыклад, ад дзясятка рыбгасаў адразу), так і рыбаводчыя гаспадаркі пры належнай рэкламе могуць прадаць дастатковую колькасць уласнай рыбы і прадукцыі яе перапрацоўкі. У якасці такога станоўчага прыкладу Вікенцій Завадскі назваў нядаўні рыбны кірмаш у Мар'інай Горцы. Гэты невялікі горад нельга параўноўваць з абласнымі па колькасці насельніцтва, тым не менш за адзін дзень усе рыбгасы, што брали ўдзел у выязным гандлі, увогуле рэалізавалі каля сямі тон рыбы.

Нагадаем, што калі летась рыбаводчыя прадпрыемствы краіны вырасцілі 16,2 тысячы тон таварнай рыбы (107 працэнтаў да ўзроўню папярэдняга года), дык у 2011 годзе яе плануецца вырасціць ужо 17 тысяч тон.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Кватэрнае пытанне

# МАЛА АТРЫМАЦЬ. ТРЭБА ПАТРАЦІЦЬ

***У першым паўгоддзі гэтага года нашу сям'ю (4 чалавекі) уключаюць у спісы на будаўніцтва новай кватэры. Вядома, што пры ўключэнні ў спісы на выдзяленне льготнага крэдыту ўлічваецца сукупны даход. Ці будуць уключаны ў яго сродкі, атрыманыя восенню мінулага года ад продажу дома, які дастаўся жонцы ў спадчыну?***

**Уладзімір,** *Мінскі р-н.*

У адпаведнасці з Палажэннем, зацверджаным Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 20 снежня 2000 г. № 1955 (з наступнымі змяненнямі і дапаўненнямі) да малазабяспечаных грамадзян, якія маюць права на атрыманне льготных крэдытаў для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылога памяшкання, аднесены грамадзяне, у якіх, у прыватнасці, сярэднямесячны сукупны даход на кожнага члена сям'і не перавышае трохразовага сярэднямесячнага сярэднедушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту (МСБ) сям'і з 4 чалавек, які падлічаны за 12 месяцаў, што папярэднічалі месяцу падачы дакументаў для ўключэння ў спісы на атрыманне льготнага крэдыту (для даведкі: Мінпрацы і сацабароны на перыяд з 1 лістапада 2010 г. па 31 студзеня 2011 г. МСБ зацверджаны ў памеры 459 620 руб., пры гэтым 3-разовы памер МСБ складае 1 378 860 руб.).

Паводле агульнага правіла, у складзе сукупнага даходу, разам з іншымі даходамі, улічваюцца і сумы, атрыманыя, у прыватнасці, ад продажу грамадзянамі жылых памяшканняў, якія знаходзяцца ў іх уласнасці.

Разам з тым неабходна мець на ўвазе, што, згодна з падпунктам 1.26 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 г. № 185, у выпадку продажу грамадзянамі жылых памяшканняў, што знаходзяцца ў іх уласнасці, грашовыя сродкі, атрыманыя ад гэтага продажу, не ўключаюцца ў даход сям'і для вылічэння сярэднямесячнага сукупнага даходу на кожнага яе члена, што дае права на атрыманне льготнага крэдыту пры ўмове накіравання названых сродкаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылога памяшкання.

**Віктар САВІЦКІ.**

## А ЎСЁ ПАЧАЛОСЯ З БАТАРЭЕК...

**Пенсіянер з вёскі Гарадзецкая Касцюковіцкага раёна выратаваў на пажары двух мужчын, паведамілі ў Магілёўскім абласным УМНС.**

27 студзеня каля 17 гадзін Эдуард Грудзінаў убачыў дым над суседняй хатай: ён крыкнуў у краме, каб выклікалі выратавальнікаў, а сам кінуўся да суседзяў. Мужчына ведаў, што ў хаце жыве адзінокі інвалід, да якога прыехаў брат: яны напярэдадні выпівалі з нагоды 9 дзён ад смерці маці. Дыму было шмат, але Эдуард убачыў на падлозе гаспадара і яго брата. Ён дапамог ім выбрацца з хаты, а сам вярнуўся, каб вынесці яшчэ і газавы балон.

Паводле папярэдняй версіі, прычынай пажару магла быць неасцярожнасць пры курэнні. Людзі засталіся жывыя, але агнём знішчана маёмасць, пашкоджаны дах. Хоць можна было б пазбегнуць і гэтых страт, калі б у доме нармальна працавалі ўсталяваныя два пажарныя апавяшчальнікі. Проста гаспадар своечасова не паклапаціўся аб замене элементаў сілкавання.

**Ілона ІВАНОВА.**

## НЯМА ЎПЫНКУ

Супрацоўнікі Пінскай міжрайінспекцыі затрымалі вадзіцеля і слесара з прадпрыемства «Пінскрайгаз», электрыка Пінскага доследнага завода пуцявых машын і індывідуальнага прадпрымальніка, якія незаконна застрэлілі 2 казулі. У іх канфіскавалі 4 стрэльбы, а яшчэ ім давядзецца заплаціць 120 базавых велічынь. На чацвярых — малавата.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Кірмаш — штотыднёвы рэкламны выпуск № 5 (667)
аддзел рэкламы 287 17 79

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ПРАДАЕЦЦА**

❒ Водаправодны вентыль (кран) пад трубу Ø 80 мм, чыгун.
Тэл. 8 017 285 84 49.

❒ А/м «Опель-Астра» 1996 г.в., 1,6Б, сіні ўніверсал мона, добры стан. 2700 у.е. без торгу.
Тэл. 8 029 316 15 94.

❒ Каляска інвалідная.
Тэл. 8 0177745923.

❒ 3-пакаёвая кватэра, 2/3, цагляны, у г. Гарадку, 30 км ад Віцебска, танна.
Тэл. 8 029 212 97 78.

❒ Шафа і канапа-ложак, б/к, у добрым стане, Нясвіжскі р-н, недалёка ад п. Сноў.
Тэл. 8 044 769 82 10.

❒ Цагляны дом у Капыльскім р-не, вада, выгоды ў доме, цвёрдапаліўны кацёл, гараж, гаспабудовы.
Тэл. 8 01719 48615, 8 044 774 44 51.

❒ А/м «Фальксваген-Пасат В3» 1990 г.в., седан, 1,8 монаўпрыск, бензін-газ, 2300 у.е.
Тэл. 8 0223651098.

❒ Каза. Акот у лютым.
Тэл. 80177660023.

❒ А/м «Мазда 626» універсал, 2000 г.в., 180 тыс. км, 4ПБ, ABS, ESP, бардовы металік.
Тэл. 8 044 709 67 66.

❒ Рухавік «Мазда 626», бензін, 170 тыс. км, патрабуе рамонту. Магілёў.
Тэл. 8 044 709 67 66.

**МЯНЯЮ**

❒ 2-пакаёвую прыватызаваную кватэру ў Віцебску, 2-гі паверх 5-павярховага дома. 45 кв. м + новую ўпарадкаваную дачу ў межах горада на жыллё ў Мінску ці С.-Пецярбургу. Варыянты.
Тэл. 80212480809.

❒ Дачу (3 узроўні) на беразе возера Лосвіда і 3-пакаёвую кааператыўную кватэру ў р.ц. Гарадок Віцебскай вобл. на жыллё ў Мінску ці С.-Пецярбургу або прадам. Варыянты.
Тэл. 8 029 290 07 10.

**КУПЛЮ**

❒ Бульбакапалку лідскую аднарадковую ці польскую двухрадковую.
Тэл. 8 029 578 74 99.

**РОЗНАЕ**

❒ Мужчына 35 гадоў шукае працу, можна разавую, падсобны, землякоп, газон, можна вучнем, люб. інш.
Тэл. 8 044 724 55 90.

ЗВЯЗДА
КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ
ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_______ №______________ Выдадзены ______________

Подпіс ____________________ Дата __________

Утерянную карточку учета нарушений и уплаты госпошлины к гос. удостоверению на право охоты № 0149486 от 17.07.1998 г. на имя Писарика Г.П. считать недействительной.

## ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**25 февраля 2011 г. проводит повторный открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение – строительство | Качество земли | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ | Срок аренды (лет) | Затраты на подготовку документации, бел. рублей | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | пересечение ул. Ефремова – пр-та Космонавтов | 340100000003002359 | 0,0024 | установка рекламного светодиодного экрана | к землям сельскохозяйственного назначения не относятся | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 5 | 1 119 691 | 488 186 | 48 800 |
| 2 | ул. Ильича, в районе кинотеатра «Мир» | 340100000007005658 | 0,0015 | установка рекламного светодиодного экрана | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона водопровода – 0,0010 га. Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 5 | 1 096 673 | 311 339 | 31 100 |
| 3 | ул. Ильича, в районе производственного швейного объединения «Гомельчанка» | 340100000007005659 | 0,0024 | установка рекламного светодиодного экрана | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона кабеля связи, водопровода, канализации – 0,0024 га. Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 5 | 1 252 396 | 273 986 | 27 300 |
| 4 | ул. Фрунзе | 340100000001004695 | 0,0032 | установка рекламного светодиодного экрана | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: водоохранная зона р. Сож вне прибрежной полосы, охранная зона подземной кабельной линии связи – 0,0008 га; водоохранная зона р. Сож вне прибрежной полосы – 0,0024 га. | 5 | 1 158 782 | 770 452 | 77 000 |
| 5 | позиция 54Б (по генплану второй очереди застройки микрорайона № 19) | 340100000001004763 | 0,0713 | здания специализированного для общественного питания | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. | 30 | 1 498 210 | 44 623 948 | 4 462 300 |
| 6 | ул. Хатаевича | 340100000001002185 | 0,6120 | многофункционального комплекса с паркингом на 300 машиномест | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона водопровода, водоохранная зона затона у судостроительного завода вне прибрежной полосы – 0,0839 га; водоохранная зона затона у судостроительного завода вне прибрежной полосы – 0,5281 га. Победителю аукциона произвести строительство подземного пешеходного перехода через ул. Хатаевича. | 50 | 1 635 842 | 547 429 541 | 54 742 900 |
| 7 | Речицкое шоссе, в районе жилых домов № 119 и № 129 | 340100000006004321 | 0,1821 | здания магазина и кафе | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона кабеля связи – 0,0104 га; охранная зона канализации, водовода, электрокабеля – 0,0298 га. | 30 | 1 423 309 | 74 479 879 | 7 447 900 |
| 8 | ул. Войсковая (бывшая территория воинской части) | 340100000006004287 | 0,3330 | здания специализированного складов | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 50 | 2 448 341 | 136 510 201 | 13 651 000 |
| 9 | пр-зд Орудийный (участок № 1) | 340100000007004921 | 0,5381 | объектов экологически чистого производства | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона водопровода – 0,0128 га. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 20 | 587 480 | 69 399 094 | 6 939 900 |
| 10 | Речицкое шоссе (в районе котельной и жилого дома № 27) | 340100000006004172 | 0,0137 | размещения павильона по оказанию услуг населению | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона канализации, теплотрассы, электрокабеля – 0,0048 га. | 10 | 1 545 604 | 4 161 519 | 416 100 |
| 11 | ул. Добрушская (станция техобслуживания) | 340100000008001613 | 0,4505 | станции техобслуживания | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона кабеля связи – 0,0168 га; водопровода – 0,0163 га. Плодородный слой почвы использовать на благоустройство прилегающей территории. | 20 | 2 532 588 | 87 694 124 | 8 769 400 |
| 12 | ул. Дорожная (в районе пешеходного моста) | 340100000008001760 | 0,0790 | павильона по оказанию услуг населению (резка стекла) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона кабеля связи и водопровода – 0,0227 га. | 5 | 923 705 | 15 084 681 | 1 508 400 |
| 13 | ул. Мазурова в микрорайоне № 19 (участок № 1 и участок № 2) | 340100000001004200<br>340100000001004201 | 0,1189<br>0,0377 | оздоровительного центра (медицинские услуги, парикмахерская, фотоуслуги, ателье, цветочный магазин) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: участок № 1 – охранная зона канализации – 0,0038 га, охранная зона подземной кабельной линии связи, подземной кабельной линии электропередачи – 0,0196; участок № 2 – охранная зона канализации – 0,0041 га. | 50 | 624 661 | 149 165 750 | 14 916 500 |
| 14 | ул. Чечерская (микрорайон № 21) | 340100000002004625 | 0,0305 | здания специализированного здравоохранения и предоставления социальных услуг (аптека) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона теплотрассы – 0,0040 га. | 30 | 1 020 365 | 14 956 660 | 1 495 600 |
| 15 | ул. Чечерская (микрорайон № 21) | 340100000001004505 | 0,0498 | здания специализированного для обслуживания населения (парикмахерская, мастерская) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Земель с ограничением в использовании нет. | 50 | 1 113 210 | 37 105 753 | 3 710 500 |
| 16 | ул. Текстильная | 340100000003001800 | 0,6789 | здания многофункционального назначения (станция техобслуживания, салон автомобилей, офисный центр, торговый центр с промышленной группой товаров) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона подземной кабельной линии электропередачи – 0,1460 га; охранная зона водовода – 0,0310 га. Выполнить технические условия по выноске КЛ и водовода. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 30 | 581 818 | 375 030 402 | 37 503 000 |
| 17 | ул. Мазурова | 340100000001003288 | 2,7581 | культурно-развлекательного оздоровительного центра «Аквапарк» | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона газопровода и водоохранная зона оз. Бурое Болото – 0,0811 га; водоохранная зона оз. Бурое Болото – 1,7335 га; прибрежная полоса оз. Бурое Болото – 0,9435 га. | 30 | 2 441 250 | 1 215 491 893 | 121 549 100 |
| 18 | пересечение ул. Мазурова–Хатаевича в микрорайоне № 18 | 340100000001004828 | 0,8342 | многофункционального центра с паркингом на 300 машиномест | | подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона водопровода – 0,1200 га. Строительство подземного пешеходного перехода через улицу Мазурова. | 50 | 1 840 429 | 920 466 511 | 92 046 650 |
| 19 | микрорайон № 18 | 340100000001004833 | 0,8091 | детского сада | | Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Участок ограничений в использовании не имеет. | 50 | 1 779 404 | 892 177 857 | 89 217 780 |
| 20 | ул. Севастопольская | 340100000007005754 | 0,0970 | специализированного здания розничной торговли непродовольственными товарами | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничение в использовании: охранная зона кабеля связи, электрокабеля, водопровода, теплотрассы – 0,0264 га. | 30 | 2 658 806 | 60 107 938 | 6 010 700 |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту в натуре.

3. Аукцион состоится **25 февраля 2011 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518, управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома. Кроме того представляют:

4.1 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.2 индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.3 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.4 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

4.5 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители юридических лиц и граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия Гомельским горисполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка.

6. Горисполкомом может предоставляться рассрочка на срок не более 3 лет в случаях, когда размер платы за право заключения договора аренды земельного участка превышает 2 000 базовых величин для граждан и индивидуальных предпринимателей и 10 000 базовых величин для юридических лиц. Плательщик, претендующий на получение рассрочки, до принятия горисполкомом решения о предоставлении земельного участка в аренду должен обратиться в горисполком о предоставлении ему рассрочки.

7. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 17.00 по 21 февраля 2011 г. включительно** в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: ул. Советская, 21а (каб. № 4).

Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.40 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

**Контактные телефоны: 77 69 35, 77 67 27; факс: 77 48 85. Наш сайт – www. gorod.gomel.by**

# ЦІ ПАДОБНЫЯ МУРКІ І БАРБОСЫ НА СВАІХ ГАСПАДАРОЎ?

Нечаканае журналісцкае расследаванне правёў фотакарэспандэнт «Звязды» Анатоль КЛЯШЧУК

ЖЫВАЯ ЗЯМЛЯ







Тое, што хатнія любімцы надзвычай дасканалыя, заўважана з даўніх часоў, калі яшчэ не было газет і не прыдумалі тэлевізараў. І не праводзіліся падобныя шоу-выстаўкі. Напрыклад, Леанарда да Вінчы пакінуў афарызм, што нават самая маленькая з кашэчых — дасканаласць. Але ж дасканаласцю прыроды заўсёды лічыўся чалавек. Вось і першае падабенства. У інтэрнэце натрапіў на выраз нейкага Юрыя Татаркіна: «Часам сабака робіцца настолькі падобны на гаспадара, што здаецца, гэта гаспадар падобны на сабаку».

Тое, што падабенства паміж чалавекам і ягонай жывёлай існуе, — гэта бясспрэчна. Неабавязкова, каб навідавоку былі падобнымі нейкія рысы твару гаспадара і муркінай ці барсікавай пыскі. Часам гэта няўлоўна — падабенства проста адчуваеш, на падсвядомасці. А калі яшчэ ў чалавека і жывёлы супадае колер вачэй? Ці ў абодвух прыплюснутыя насы!? Нярэдка гаспадыні фарбуюцца ў колер свайго дамачадца — белы, рыжы ці чорны. Альбо робяць сабе стрыжку валасоў «а-ля кіса». Ці апранаюць чатырохногага сябра ў сукенку альбо кабацік з колерамі свайго адзення.

Але найбольшае падабенства тут — дабрыня. Па сутнасці, усе людзі, якія трымаюць хатніх жывёл, не могуць быць дрэннымі ці жорсткімі. Іх любімцы адказваюць на дабрыню сваёй ласкай, рахманасцю, вернасцю. У Геракліта таксама было выслоўе пра жывёл. Яно мне спадабалася, хоць да тэмы падабенства непасрэднага дачынення не мае: «Жывёлы, калі жывуць разам з людзьмі, робяцца ручнымі, а людзі ў адносінах адно да аднаго робяцца дзікімі».

Але гэта пра тых, якія не сябруюць ні з кошкамі, ні з сабакамі. На выстаўцы гэткіх не было — ні сярод наведвальнікаў, ні (што зразумела) сярод гаспадароў і гаспадынь мурак і барбосаў.

**НАГОДАЮ для фотасесіі з жывёламі стала выстаўка пародзістых кошак і сабак, якая прайшла ў нацыянальным выставачным павільёне на сталічнай вуліцы Янкі Купалы. Нават «Белэкспа» адчыніла дзверы для экспазіцыі і гандлю жывым таварам (раней выстаўкі праводзіліся ў палацах культуры). Больш за тое, — наладзіла спаборніцтвы, танцы і дэфіле сярод хатніх любімцаў. Танцы з сабачкамі арганізатары назвалі чамусьці «фрыстайлам», а ўсеагульны агляд апранутых у сукенкі і з кідкімі бантамі жывёл назвалі «касцюміраваным шоу». Гучна прамоўлена! Можа. таму і чарга да выставачнага комплексу была адпаведнай. Нават кошт квіткоў не палохаў наведвальнікаў — 12 тысяч рублёў.**







## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.57 | 16.50 | 8.53 |
| Віцебск — | 7.52 | 16.34 | 8.42 |
| Магілёў — | 7.47 | 16.40 | 8.53 |
| Гомель — | 7.39 | 16.42 | 9.03 |
| Гродна — | 8.11 | 17.06 | 8.55 |
| Брэст — | 8.06 | 17.12 | 9.06 |

### Месяц

*Маладзік 3 лютага.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

### Імяніны

***Пр.** Антона, Арсенія, Макара, Мікалая, Пятра, Фёдара.*

***К.** Брыгіты, Ігната.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




Жаночы клуб

# НАГОДА ДЛЯ ВЯЧЭРНЯЙ СУКЕНКІ

**ДЛЯ тых, хто яшчэ мае ахвоту адзначаць навагоднія святы, а таксама для тых, хто па нейкіх прычынах застаўся імі незадаволены ці проста не змог адзначыць іх так, як хацелася, пачатак лютага прадастаўляе выдатную магчымасць паўтарыць сустрэчу Новага года. Менавіта 3 лютага наступае Год Труса (Ката) па кітайскім календары. Чым не нагода для арганізацыі цудоўнай вечарыны?**

**Не сакрэт, што для жанчыны залог удалага свята — яе шыкоўны знешні выгляд. Чым больш зайздросных позіркаў яна на сабе адчуе, тым лепш прайшло мерапрыемства. Таму, каб не сапсаваць сабе настрой, пра ўбор лепш паклапаціцца загадзя.**

БЯСПРОЙГРЫШНЫ варыянт — **вячэрняя сукенка**, паколькі менавіта яна падкрэсліць вашу жаноцкасць. Паколькі ў Год Труса (Ката) актуальнымі будуць **белы, жоўты** і **залаты колеры**, то менавіта ім варта аддаць перавагу пры выбары святочнага гардэробу. Выдатна падыдуць тканіны з бляскам ці расшытыя паеткамі і бісерам.



ДЛЯ моднага сезона 2011 па-ранейшаму актуальна **міні**. Маладым дзяўчатам з добрай фігурай падыдуць кароткія сукенкі даўжынёй вышэй за калена. Калі сустрэча Новага года намячаецца ў клубе, то кароткая навагодняя сукенка — выдатны варыянт. Можна выбраць навагоднюю сукенку **з аборкамі**. Жанчыны ў такіх нарадах выглядаюць асабліва рамантычна. Больш за тое, аборкі вельмі худзенькім дзяўчатам дадаюць форм. Яшчэ модная тэндэнцыя, якая перайшла ў спадчыну ад 2010 года, — **драпіроўка**. Яна дазваляе пераўтварыць жанчыну ў багіню, схаваць недахопы фігуры. Умела падабраныя драпіроўкі выглядаюць шыкоўна.



АДНАК дызайнеры вырашылі не абмяжоўваць каляровую гаму навагодніх убораў толькі трыма колерамі. У наступным модным сезоне запатрабаванымі будуць **усе адценні чырвонага — барвовы, каралавы, бардо, аранжавы**. Чырвоны — гэта колер страсці, цёплы, яскравы і вельмі прывабны для асоб процілеглага полу.

Акрамя таго, у 2011-м актуальнымі будуць **колеры мора — блакітны, сіні, колер марской хвалі, бірузовы**.

**Чорная сукенка**, як заўсёды, выратуе пры недахопе часу і крызісе выбару. Чорны колер у модзе заўсёды. І пры гэтым ужо не важна, шыкоўны гэта чорны ўбор ці маленькая сціплая чорная сукенка. Можна дапоўніць яе яркімі аксесуарамі. Галоўнае, каб было зручна і элегантна.

**СУКЕНКА на адным плячы** — лёгкі святочны і адначасова ўрачысты фасон. Акрамя таго, гэта вельмі сэксуальна. Ідэальны варыянт для сустрэчы Года Труса.







Цяпер некалькі слоў пра аксесуары і макіяж. Упрыгожванні ў Год Труса (Ката) павінны быць металічнымі. Тут галоўнае — не перабраць меры. Паколькі сукенкі з аборкамі, драпіроўкамі і валанамі самадастатковыя, яны не патрабуюць дадатковых аксесуараў. На крайні выпадак можна «задзейнічаць» бранзалеты.

Можны навагодні макіяж — з акцэнтам альбо на вусны, альбо на вочы. Стылісты раяць усё ж аддаць перавагу вачам.

Абавязковая дэталь навагодняй вечарыны — абутак. Модны абутак 2011 — гэта па-ранейшаму танкетка на высокім абцасы, платформа. Усё часцей у новых калекцыях дызайнераў можна сустрэць класічныя модныя туфлі з завостраным носам, розныя варыянты ўпрыгожвання абцаса, шмат шнуроўкі.

Навагоднюю прычоску можна аздобіць з дапамогай гелю з блёсткамі ці металізаванай адценачнай тушы.

Але самае галоўнае ў вечарыне — ваш настрой. Паўтарыце колькі разоў перад люстэркам, што вы — самая абаяльная і прывабная і — наперад, пакараць мужчынскія сэрцы. Прыемнай вам навагодняй вечарыны.

**Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.**

## Мінчане здаюць у гарадскі заапарк трусоў, шыншыл, віслапузых свіней і нават страусаў

**Сярод жывёл, якіх мінчане здаюць у сталічны звярынец, сустракаюцца не толькі трусы і шыншылы, але нават в'етнамскія віслапузыя свінні і страусы. Пра гэта паведаміла метадыст асветніцкага аддзела Мінскага заапарка Аксана Багавец.**

Усе жывёлы, якіх прыносяць гараджане, праходзяць ветэрынарны агляд, а пасля каранціну становяцца паўнапраўнымі жыхарамі заапарка. Сёлетняй зімой мінчане прынеслі ў звярынец параненых і знясіленых птушак.

— У канцы снежня да нас трапіў лебедзь са зламанай лапкай, — расказала А. Багавец. — Яму зрабілі аперацыю, і цяпер ён жыве ў птушніку разам з іншымі цеплалюбівымі птушынымі: буслямі, султанкамі, паўлінамі і перапёлкамі.

Акрамя параненага лебедзя ў заапарк трапіла вушастая сава. Яе знайшлі ў цэнтры горада падлеткі. Мінчане прынеслі таксама двух збітых машынай канюкоў. Птушкі паправіліся, і іх ужо выпусцілі на волю. Яшчэ адным набыткам стаў грак, які жыў у сям'і мінчан. Але з-за алергіі гаспадары вымушаны былі яго аддаць. Цяпер грак удзельнічае разам з іншымі гадаванцамі заапарка ў выязных выставах.

**Наталля ВАВІЛАВА,**
*«Мінск—Навіны».*

## Вучоныя вызначылі самыя цяжкія дзень і гадзіну рабочага тыдня

**Ну думку брытанскіх вучоных, самы напружаны момант тыдня для офісных работнікаў прыпадае на 10 гадзін раніцы аўторка, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Брытанская кампанія Michael Page правяла апытанне, у якім прынялі ўдзел 3 тыс. чалавек ва ўзросце ад 18 да 45 гадоў. Палова з апытаных прызнала, што пік стрэсу прыпадае на сярэдзіну раніцы аўторка, калі навальваецца мноства задач. Гэта тлумачыцца тым, што панядзелак работнікі праводзяць у больш-менш расслабленым пасля выхадных стане, а вось у аўторак даводзіцца вырашаць усе праблемы, што ўтварыліся за гэты час, з чым звязаны і высокі ўзровень стрэсу.

Пры гэтым для 75 працэнтаў удзельнікаў даследавання спад наступае ўжо да 11:16 раніцы. Чатыры з дзесяці апытаных, карыстаючыся выпадкам, абвінавацілі ў стрэсах цяжкія нагрузкі, трое з дзесяці скардзяцца на начальства як крыніцу напружання, кожны шосты незадаволены няўважлівасцю калег. «Відаць, наша работа — асноўная прычына стрэсу ў жыцці. Нават дробязі накшталт завісання камп'ютара могуць выбіць з каляіны», — адзначаюць даследчыкі.

## 1 лютага

Дзве даты

**1913 год** — нарадзіўся Сяргей Восіпавіч Прытыцкі, вядомы беларускі партыйны і дзяржаўны дзеяч, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Адзін з арганізатараў патрыятычнага падполля і партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1936 годзе за рэвалюцыйную дзейнасць быў прысуджаны да смяротнага пакарання. Пад ціскам сусветнай грамадскасці прысуд быў заменены на пажыццёвае турэмнае зняволенне. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі займаў шэраг адказных пасад на дзяржаўнай службе Беларусі. У 1942-44 гг. — 2-гі сакратар ЦК ЛКСМБ, затым у 1944-45 гадах начальнік Польскага штаба партызанскага руху. З 1968 года — Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і намеснік старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Аб яго рэвалюцыйнай дзейнасці зняты кінафільм «Чырвонае лісце».



**1975 год** — амерыканскія спецыялісты Біл Гейтс і Пол Ален заснавалі кампанію «Майкрасофт». Цяпер — вядучы сусветны вытворца праграмнага забеспячэння для персанальных камп'ютараў.

Цытата дня:

***«Кожны павінен мець нейкія дрэнныя звычкі, каб было ад чаго адмовіцца, калі здароўе пагоршыцца».***

**Франклін П. Джонс.**

## КАЛОДЗЕЖ

**Часцей за ўсё калодзеж капалі на тэрыторыі сваёй гаспадаркі, але бывала і так, што з аднаго калодзежа ваду брала ўся вёска. Калі пры хаце быў свой калодзеж, імкнуліся не піць ваду з чужога: лічылі, што тады «свая вада не пацячэ». Калодзеж успрымаўся ў народнай культуры як памежная прастора — канал сувязі з іншым светам. Шэраг казак пачынаецца з таго, што дзяўчына ўпусціла вядро ў калодзеж і прыйшлося ёй ісці шукаць сваю рэч у «тым свеце».**

- Калі бралі ваду з калодзежа, катэгарычна забаранялася выліваць яе назад. Такія дзеянні тлумачыліся тым, што «адтуль» на нас глядзяць продкі.
- Пры будаўніцтве калодзежа ўлічвалі шэраг фактараў, выбіралі найбольш спрыяльны час. Звычайна пачатак работ прымяркоўвалі да маладзіка, раніцы. Такую справу не даручалі тым, за кім замацавалася кепская слава.
- Першую зямлю на месцы будучага калодзежа неабходна было выбраць у выглядзе крыжа. Затым у цэнтр крыжа (радзей — круга) вылівалі асвячоную на Хрышчэнне ваду і чыталі замовы. Таму, хто капаў зямлю, дарылі новую кашулю ці кавалак палатна, а ў калодзеж кідалі манеты.
- Першай вадой паілі ўсіх членаў сям'і, хатнюю жывёлу і птушку. Сачылі за тым, каб яе не выпіў хто-небудзь іншы і не забраў здароўе сям'і, дабрабыт.
- З прыходам хрысціянства выкарыстоўваць ваду з новага калодзежа можна было толькі пасля яе асвячэння.
- Чысціць калодзеж дазвалялася ў пэўныя дні года. Самым спрыяльным для гэтага днём быў пярэдадзень Івана Купалы: лічылася, што пасля гэтага вада ў калодзежы будзе асабліва карыснай і «здаровай». У паўночных рэгіёнах лічылі, што калодзеж неабходна чысціць перад Вялікаднем. Спрыяльным часам для гэтага лічыўся дзень святкавання Успення Багародзіцы — 28 жніўня. Забаранялася чысціць калодзежы пасля Узвіжання (27 верасня). Па ўяўленнях продкаў ластаўкі, каб перазімаваць, хаваюцца ў калодзежы ў міфічнай краіне Ірый (вырай).
- Забаранялася браць ваду, асабліва ў дні вялікіх свят, чужым людзям — каб не перадаць ім дабрабыт. Забаранялася хадзіць да калодзежа цяжарнай жанчыне, на працягу 40 дзён пасля родаў. Калі гэтая забарона парушалася, жанчына кідала ў калодзеж некалькі драбінак солі, каб вада не «сапсавалася». Забаранялася браць ваду з калодзежа ў дзень Благавешчання да ўзыходу сонца і раніцай на Юр'я, калі зямля «адпускае» атруту і робіць юраўскую расу атрутнай.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся

Калі сантэхнік зайшоў у вашу кватэру і зняў абутак — не выпускайце яго з поля зроку. Хутчэй за ўсё, ён можа быць небяспечным злачынцам.

☺

**Жонка — мужу:**

**— Не ведаю, з якой бялізнай мыць тваю цяльняшку — з чорнай ці з белай?**

**— А ты палоскі палічы...**

☺

Казка народа майя:

«Жылі яны доўга і шчасліва. І памерлі ў адзін дзень — 21 снежня 2012 года».

☺

**Дзеці — кветкі жыцця :-)**

**— Мама, ведаеш, я ў аўтобусе цётачцы на нагу наступіў і папрасіў прабачэння, а яна мне за гэта цукерку дала.**

**— А ты, вядома ж, падзякаваў ёй, так?**

**— Не, я ёй на другую нагу наступіў.**

☺

Святы.

14 лютага — Дзень сэксу за паштоўку.

23 лютага — Дзень мужчынскага дэзадаранту.

8 сакавіка — Дзень помсты за дэзадарант.



Дарагую мамачку, клапатлівую бабулю, цудоўную жанчыну **Святлану Цімафееўну САМУЛЕВІЧ** віншуем **з днём нараджэння**! Жадаем моцнага здароўя, бадзёрага настрою, радасці ў жыцці. Няхай у вокны твайго дома заўсёды свеціць сонейка, у сям'і будзе лад і згода, а кожны новы дзень прыносіць радасць.

*Мы вместе в день рожденья твой*
*Желаем сердцем и душой*
*Здоровья, бодрости и смеха,*
*Во всех делах твоих успеха.*
*И чтоб светила бы всегда*
*Тебе счастливая звезда.*

**Муж, сын, дачка, зяць, унукі.**

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» віншуе сваю супрацоўніцу **Святлану Цімафееўну САМУЛЕВІЧ** з **днём нараджэння** і жадае ёй у гэты святочны дзень усяго самага найлепшага!



## ЗАМКНУЎ КАСІРА І АБРАБАВАЎ КАСУ

**Касір адной з букмекерскіх кантор Брэста ў 21 гадзіну хацела зачыніць уваходныя дзверы, але нехта рашуча паставіў нагу на парог і не даў ёй гэта зрабіць.**

Затым, пагражаючы нажом, зламыснік адабраў у 23-гадовай супрацоўніцы ключы і тэлефон, зачыніў яе ў падсобным памяшканні і выграб з сейфа выручку — больш за 6 240 000 рублёў, пасля чаго знік. Крыху ачомаўшыся, касір націснула на трывожную кнопку. Рабаўнік вышукваецца.

**Яна СВЕТАВА.**

## ВАРТАЎНІК НА ДЗЯЖУРСТВЕ... САГНАЎ СЛУЖБОВАЕ АЎТО

Супрацоўнікі ДАІ Ушацкага РАУС на вуліцы Камсамольская вечарам затрымалі аўто «ГАЗ-2705» (груза-пасажырскі фургон, больш вядомы як «Газель». — **А.П.**), які належыць філіялу дарожна-эксплуатацыйнага ўчастка. За рулём у нецвярозым стане быў вартаўнік філіяла. Потым высветлілася, што ён быў раней судзімы за ўгон. Падчас дзяжурства на тэрыторыі прадпрыемства гэты 22-гадовы вартаўнік залез у кабіну незачыненай машыны. Ключы былі ў замку запальвання. Вартаўнік завёў аўто і паехаў. Катаўся, праўда, нядоўга. Заведзена крымінальная справа.

## 111 АРТЫЛЕРЫЙСКІХ СНАРАДАЎ У ВЁСЦЫ

Пры правядзенні земляных работ у вёсцы Шапуры Віцебскага раёна рабочыя знайшлі 111 артылерыйскіх снарадаў калібру 76 міліметраў. Сапёры вывезлі небяспечную знаходку часоў Вялікай Айчынай вайны ў бяспечнае месца і знішчылі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 491. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12